

ЗМЕНЫ ДЛЯ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ САМАКАТАЎ 4

ЧАСЦІНКА БЕЛАРУСІ Ў ТАТАРСТАНЕ 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 ЛІПЕНЯ 2022 г. СУБОТА № 143 (29765)

**КОРАТКА**

• **Новым паслом Беларусі ў Расіі стане Дзмітрый Крутой. Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін у ходзе праведзенай тэлефоннай размовы ўзгаднілі пытанне назначэння новага пасла Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі.**

• З-за павелічэння попыту БЧ прызначыла новыя рэйсы цягніка Мінск—Санкт-Пецярбург—Мінск.

З першых вуснаў

## «ПАЧНЁМ НАРЭШЦЕ ПРАДАВАЦЬ БЕЛАРУСКАЕ ЯК НАЛЕЖЫЦЬ. У ПОЎНЫМ АБ'ЁМЕ»

### Прэзідэнт наведаў гандлёвы цэнтр «Сталіца»

**Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з работай і перспектывамі развіцця гандлёвага цэнтра, наведаў фірменныя магазіны, аб'екты гандлю і грамадскага харчавання, дзе прадстаўлены шырокі асартымент прадукцыі айчыннай вытворчасці. Прэзідэнту было далажана, што свабодных месцаў у гандлёвым цэнтры «Сталіца» цяпер практычна не засталося — яны ўсе запоўнены, і пераважна айчыннымі брэндамі.**

«Тое, што вы зрабілі нарэшце за час існавання гэтага аб'екта беларускі гандлёвы цэнтр — гэта ўжо добра», — адрэагаваў кіраўнік дзяржавы. Такі ж аб'ект Прэзідэнт даручыў зрабіць і на месцы даўгабуду «Магніт Мінска» на скрыжаванні праспекта Незалежнасці і вуліцы Калінoўскага. Комплекс пачалі будаваць яшчэ ў 2009 годзе. З таго часу работы так і не былі завершаны. «Трэба стварыць дакладна такі, па гэтым прынцыпе, — даручыў Аляксандр Лукашэнка. — Беларускае, беларускае і беларускае. Нас ніхто не папракне з іншаземцаў. Пайшлі — ідзіце. Мы будзем прадаваць сваё. Таму там павінен быць такі гандлёвы цэнтр». Работы на месцы даўгабуду Прэзідэнт даручыў пачаць у найбліжэйшы час, не зацягваць гэты працэс.

СТАР. 2




Фота БелТА.

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«Запатрабаванай формай арганізацыі працоўнай занятасці навучэнцаў з'яўляецца работа ў лагерах працы і адпачынку, дзе непаўналетнія маюць магчымасць не толькі адпачыць, але і зарабіць. Вывучэнне патрэбнасці ў арганізацыі работы такіх лагераў паказала, што кожны год больш як 12,5 тысячы дзяцей ахоплена названым відам занятасці. Паводле аператыўнай інфармацыі рэгіёнаў, адпачынак і аздараўленне ў ЛПА гэтым летам ужо прайшло больш за 10 тысяч дзяцей. Акрамя таго, запатрабаваным з боку непаўналетніх з'яўляецца самастойнае працаўладкаванне. Ім у краіне ў 2021 годзе было ахоплена больш за 30 тысяч падлеткаў. На пачатак ліпеня звыш за 16 тысяч чалавек ужо самастойна працаўладкавана, у тым ліку больш за 300 непаўналетніх, з якімі праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа».*

Лічбавы беларус

## АДЗІН ЗАПЫТ — ДВАНАЦЦАЦЬ АДКАЗАЎ



### Якія электронныя паслугі даступныя ў асабістым кабінеце

**Разглядам пэўных паслуг, якія чалавек можа заказаць праз свой асабісты электронны кабінет, а таксама тлумачэннямі, навошта яны могуць спатрэбіцца і чым будуць карысныя, мы распачынаем новую рубрыку «Лічбавы беларус». У ёй з дапамогай спецыялістаў Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг (НЦЭП) пастараемся простымі словамі расказваць пра тое, што сучасны беларус можа атрымаць ад свайго электроннага кабінета, які сёлета ўжо створаны для кожнага нашага грамадзяніна на Адзіным партале электронных паслуг (АПЭП).**

СТАР. 5

Па палічках

## СЁННЯ Ў МІНСКУ БОЛЬШ ЗА 17 ТЫСЯЧ ЗДЫМНЫХ КВАТЭР

### Цэны на іх працягваюць зніжацца



**Для іншагародніх студэнтаў першая цяжкасць пры паступленні ў інстытут — зусім не сесія, а пошук кватэры. Гэта калі не далі інтэрнат, а такое здараецца нярэдка.**

**Новаспечаныя студэнты сталічных ВНУ пачынаюць «уплываць» на рынак арэнды жылля ў сярэдзіне жніўня. Але «прасунутыя» студэнты і маладыя спецыялісты займаюцца пошукам жылля ўжо ў ліпені. У другім месяцы лета, як правіла, яшчэ не назіраецца сезоннага ажыятажу і выбар кватэр яшчэ досыць вялікі. Але...**

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

22143

# «ПАЧНЁМ НАРЭШЦЕ ПРАДАВАЦЬ БЕЛАРУСКАЕ ЯК НАЛЕЖЫЦЬ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як паведамілі кіраўніку дзяржавы ў ходзе наведвання магазіна аднаго з вядомых беларускіх кандытарскіх брэндаў, цяпер на рынку вызваліліся нішы за кошт сыходу шэрага замежных пастаўшчыкоў. Аляксандр Лукашэнка ставіць задачу ў гэтых умовах умацаваць пазіцыі не толькі ў бягучым моманце, але і на перспектыву. «Рынак наш унутраны. На знешнім нас таксама ведаюць. Але нам шмат і не трэба. Што мы ўжо, гіганты нейкія... Трэба забяспечыць сваіх людзей работай і зарплатай», — падкрэсліў беларускі лідар.

На айчынную «кандытарку» вялікі попыт і ў замежжы, у тым ліку ў Кітаі. Таму яшчэ адна задача — пры неабходнасці пашыраць вытворчасць, адкрываць новыя лініі.

У гэтым самым рэчышчы ляжаць і задачы рэгіянальнага развіцця. Іншае кандытарскае прадпрыемства, з прадукцыяй якога таксама азнаёміўся кіраўнік дзяржавы, адкрыла невялікую вытворчасць у Слаўгарадзе на паўднёвым усходзе Магілёўскай вобласці. «Тое, што трэба», — адрэагаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ў невялікіх гарадах важна ствараць такія вытворчасці на 70—100 рабочых месцаў.

Наведаў Прэзідэнт і гандлёвыя пункты айчынных брэндаў лёгкай прамысловасці. Яму распавялі аб асартыменце, навінках. Напрыклад, на працягу апошніх гадоў стабільна расце попыт на прадукцыю з лёну. Як і ў выпадку кандытарскай галіны, ішла гаворка аб пастаўках сыравіны, больш актыўнай рабоце на ўнутраным рынку.

У гандлёвым цэнтры для айчынных брэндаў стварылі прывабныя ўмовы і з пункту гледжання арэнды гандлёвых пляцовак. Аляксандр Лукашэнка даручыў унесці прапанову, каб паводле гэтага стандарту працавалі і ў іншых месцах.

Зайшоў Прэзідэнт і ў краму мерча «Першы». Яму расказалі, што прадукцыя актыўна купляецца не толькі ў стацыянарных гандлёвых пунктах, але і ў рамках выязнога гандлю на розных святах і фестывалях. Часта бяруць мерч у якасці сувеніраў і падарункаў замежныя госці з самых розных краін. Дарэчы, на адной з нядаўніх навінак ёсць і аўтограф Аляксандра Лукашэнкі. Ён таксама даў некаторыя практычныя рэкамендацыі ў частцы дызайну тавараў і акцэнтаваў увагу, што цэны павінны быць даступнымі.

Наведванне гандлёвага цэнтра гэтым не абмежавалася. Пабываў кіраўнік дзяржавы і ў мэблевай краме, гандлёвых кропках мясной прадукцыі аднаго з агракамбінатаў, фарфору, на аб'ектах грамадскага харчавання. Усюды ішла дзелавая гутарка аб умовах працы, перспектывах пашырэння асартыменту і сеткі гандлёвых пунктаў, магчымых цяжкасцях і шляхах іх пераадолення. Як завездзена, не абышлося і без дэгустацыі. Аляксандр Лукашэнка асабіста ацаніў смакавыя якасці прадуктаў.

«Трэба прадаваць беларускае. Усе хочуць добры заробак. А добры заробак — калі рэалізоўваецца тавар. А што ж мы ўнутраны рынак аддалі невядома каму і сядзім рукі склаўшы?» — сказаў кіраўнік дзяржавы. Характарызуючы цяперашнюю сітуацыю ў гандлі, калі ўскладнены продажы на знешнія рынкі некаторых замежных краін, ён нагадаў выраз «Не было б шчасця, ды няшчасце памагло». «Гэта падштурхне нас да таго, што мы пачнём нарэшце прадаваць беларускае як належыць, у поўным аб'ёме», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

## Тэлефонная размова Прэзідэнтаў

**Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін учора правялі тэлефонную размову, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Галоўнай тэмай размовы стала двухбаковае супрацоўніцтва. Быў абмеркаваны комплекс асноўных пытанняў у галіне эканомікі, у тым ліку канкрэтныя праекты па імпартазамяшчэнні.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі і міжнародны парадак дня. Асобна Прэзідэнт Расіі праінфармаваў беларускага калегу аб праведзеных перагаворах у Тэгеране.

Кіраўнік беларускай дзяржавы ў сваю чаргу падзякаваў калегу за падтрымку нашага нацыянальнага авіяперавозчыка.

Акрамя таго, Прэзідэнты Беларусі і Расіі ўзгаднілі пытанне назначэння новага пасла Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі. Агрэман беларускім бокам ужо атрыманы.

Уладзіміра Сямашку на гэтай пасадзе зменяе намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой, які ў свой час непасрэдна займаўся распрацоўкай саюзных праграм па паглыбленні інтэграцыі.

Абмеркавалі кіраўнікі дзяржаў і графік маючых адбыцца кантактаў.

## Адданае служэнне справе

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з прафесіянальным святам — Днём пажарнай службы — работнікаў і ветэранаў органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях краіны.**

«Дзякуючы высокаму прафесіяналізму, хуткасці рэагавання і зладжанасці дзеянняў супрацоўнікаў органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, жыхары і госці краіны могуць быць упэўненыя, што іх жыццё, здароўе, маёмасць пастаянна знаходзяцца пад надзейнай аховай», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэзідэнт адрасаваў асаблівыя словы ўдзячнасці ветэранам, якія стаялі каля вытокаў фарміравання пажарнай службы. Ён таксама выказаў упэўненасць, што, працягваючы традыцыі адданага служэння справе, краіне і народу, беларускія пажарныя і далей будуць з гонарам і годнасцю несці службу на карысць нашай любімай Беларусі і яе народа.

# «Я НЕ МАГУ НЕ БЫЦЬ АПТЫМІСТАМ»

## Новыя падрабязнасці інтэрв'ю Прэзідэнта агенцтву «Франс Прэс»

**Адказы Аляксандра Лукашэнкі на пытанні французскага журналіста ўжо літаральна разабралі на цытаты ва ўсім свеце. Мы сабралі выказванні кіраўніка дзяржавы ў адзін матэрыял.**

### Аб гатоўнасці абараняць краіну

«Мы ва ўсёй красе сёння бачым, напрыклад, якую палітыку праводзіць Польшча. Вы хацелі, каб я спакойна глядзеў, што Польшча бачыць у сваіх уладаннях, у сваім складзе, цытую іх, усю Беларусь?» «Калі б заўтра Германія заявіла, што яны хочуць бачыць у складзе Германіі Францыю, якую б вы пазіцыю занялі? Вось я і жорстка на гэта рэагую. Мае асноўныя паўнамоцтвы — абарона суверэнітэту і незалежнасці дзяржавы. Я гэта раблю. Калі супраць гэтага будзе змагацца апазіцыя, нейкія асобныя людзі ці дзяржавы будуць прэтэндаваць на суверэнітэт і незалежнасць Беларусі, я на ўвесь рост устану і буду супраць гэтага змагацца, трэба — са зброяй у руках».

### Пра расійскіх ваенных на тэрыторыі Беларусі

«Заўсёды яны былі настолькі, наколькі гэта трэба было нам. У тым ліку і мне, паколькі я іх запрашаў. Ніводзін расійскі ваеннаслужачы сюды не прыехаў без майго запрашэння або дазволу. Таму ўсе яны знаходзяцца з маёй згоды. Гэта функцыя Прэзідэнта. Ніводны ваеннаслужачы (разведчык, контрразведчык і іншыя) не можа тут быць без майго ведама».

«Які суверэнітэт і незалежнасць яны парушаюць, калі я іх папрасіў у чымсьці дапамагчы?»

### Аб санкцыях

«Вы плюнулі на нас, паспрабавалі ногі выцерці і аб мяне, і аб маю краіну, аб народ. Я вам гэтага не дазволю і не дазволю. З санкцыямі мы справімся. Страцілі мы паўмільярда долараў тавараабароту з Францыяй, знойдзем у іншым месцы. Пры гэтым страты беларускага боку будуць меншыя за паўмільярда, бо ўзаемны гандаль з Францыяй так ці інакш працягваецца і цяпер. На 20 % тавараабарот сёлета ўпаў, але мы ўсё роўна гандлюем з вамі і будзем больш гандляваць. Вось заўтра вам не будзе чым народ карміць, засуха і іншае? Можа, мы вам нечага паставім. Мы заўсёды вам пастаўлялі і ў Еўропу ў цэлым рапсавы алей замест сланечнікавага, аліўкавага. Мы вельмі шмат вырабляем рапсу і пастаўляем вам, і будзем пастаўляць. Вам патрэбная драўніна, мэбля і іншае. Вы куплялі ў нас. Мы і будзем вам пастаўляць. Бізнес заўсёды знойдзе гэтыя шляхі. Проста вар'яцтва — уводзіць сёння санкцыі ў гэтым узаемазалежным свеце. Але вы гэта робіце».

### Аб міратворчай ролі Беларусі

«Першая міратворчая. Як толькі пачаўся гэты канфлікт, ведаючы ў цэлым, без дэталяў, што адбываецца і што адбудзецца, я цэлы дзень тэлефанаваў Зяленскаму і прасіў яго: "Валодзя, сядзь, калі ласка, за стол перагавораў. Гэта ж табе не на шкоду. Камунікуйце. Любы мір заўсёды лепшы за самую добрую вайну"». Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што пасля гэтага ў Беларусі адбылося некалькі «вельмі паспяховых» раўндаў перагавораў паміж Расіяй і Украінай. Але Захад — перш за ўсё ЗША і Вялікабрытанія — забаранілі Украіне працягваць іх.

### Аб падзеях 2020 года

«У 2020 годзе вы хацелі яшчэ і Беларусь зламаць, каб выбудаваць гэты пояс ад Чорнага мора да Балтыкі і ўжо стаяць каля парога Масквы. Калі б Беларусь тады зламалі, натаўскія войскі былі б ужо пад Смаленскам. Гэтыя «ўлады», прадстаўнікі, у вас сядзяць: Ціханоўская і іншыя. Ціханоўская — гэта пацанка, яна нічога не вырашае. Мы ведаем, хто за ёй стаіць і хто што вырашае. Вы за ёй стаіце і ёй кіруеце — амерыканцы і Еўрасаюз. Калі б тады, у 2020 годзе, мы не выстаялі, тут было б горш, чым ва Украіне. Мы вытрымалі».

### Аб падтрымцы СВА

«Я сапраўды падтрымліваю Расію. І не толькі таму, што ў нас саюз з Расіяй. І не толькі таму, што мы юрыдычна гэта абавязаныя рабіць: мы ж дагавор з Расіяй заключылі аб стварэнні адзінай групоўкі войскаў на заходнім кірунку, асновай якой з'яўляецца беларуская армія. Даўно вядома, гэта наша дактрына. Не толькі таму. А таму што мы бачылі прычыну гэтай вайны. Прычына ў тым, што вы, калі б Расія не апярэдзіла вас, натаўцаў, арганізаваліся і нанеслі супраць яе ўдар. Я ў гэта веру, і Расія ў гэта верыць. І так было б».

«Вы, натаўцы, амерыканцы, хацелі гэтай вайны. І калі б Пуцін не пачаў гэтую аперацыю, вы б яе пачалі, але ўжо арганізаваўшыся. Ён проста вас крыху апярэдзіў. Такая пазіцыя Расіі і Беларусі».

«Вы мяне папракаеце ў тым, што я агрэсар. А вы хто? Вы ж туды зброю пастаўляеце. Вашых наёмнікаў там 20 тысяч перавярнулася, у тым ліку з Францыі. Вы самыя сапраўдныя агрэсары!»

У той жа час, заўважыў кіраўнік дзяржавы, Беларусь ні тэхнікай, ні жывой сілай не ваюе ва Украіне. З беларускай тэрыторыі былі нанесены ўдары па ваенных аб'ектах Украіны, але гэта было зроблена ў прэвентыўных мэтах. «Навошта разгарнулі на граніцы чатыры дывізіёны? Навошта вы нацэліліся супраць нас? — спытаў ён. — Вы хочаце сказаць, што я павінен быў сядзець і чакаць, пакуль на галаву беларускаму народу ракеты пачнуць падаць? Не».

«Мы да гэтага часу гаворым: так, мы ўдзельнічаем у аперацыі. Але якім чынам: мы закрылі захад, паўднёвы захад Беларусі, каб вы адтуль не ўдарылі ў спіну рускім. Вось наш удзел. Так, мы лячылі параненых, загінулых людзей прымалі на тэрыторыю Беларусі. Мы лекі перадавалі і перадаём і ўкраінцам, і расіянам. Гэта наш удзел у гэтай аперацыі. Мы людзей не забіваем».

### Аб ядзернай зброі ў Беларусі

«Нам дастаткова, што ядзерная зброя ёсць у Расіі. Калі трэба, Расія па дагаворы будзе абараняць Беларусь як сваю тэрыторыю. У нас такі дагавор. Таму калі трэба прымяніць ядзерную зброю... Не дай бог, вядома, каб гэта было. Таму што гэта канец».

«Я наогул праціўнік ядзернай зброі. Катэгарычны праціўнік. Яе трэба цалкам у свеце знішчыць. І свет будзе спакайней спаць».

Разам з тым Прэзідэнт звярнуў увагу, што натаўцы ў Еўропе трэніруюцца на самалётах, здольных несці ядзерныя бомбы і зарады. «Ну а чаму мы не павінны да гэтага рыхтавацца? Вось мы і дамовіліся, што мы даабсталюем нашы самалёты, каб яны маглі несці ядзерную зброю. Але мы гэта і самі можам зрабіць. У нас ёсць авіяцыйныя заводы, якія здольныя па расійскіх тэхналогіях пераабсталяваць. Там цяжкасцяў ніякіх няма. І, як мне вайскоўцы сказалі, гэта пытанне некалькіх месяцаў... Вы перастанеце (натаўцы, амерыканцы) гэта рабіць — мы гэтага не будзем рабіць. Нам гэта не трэба».

### Пра будучыню

«Я гляджу з аптымізмам, бо ў мяне, як і ў вас, ёсць дзеці. Я не магу не быць аптымістам. Я хачу, каб нашыя дзеці жылі не так, як мы нават. А жылі лепей. Вось аснова майго аптымізму».

«Усё скончыцца добра?» — удакладніў журналіст.

«Калі вы гэтага захочаце, скончыцца добра. І для вас нават нечакана хутка. Скарыстайцеся гэтым момантам. Натаўцы, амерыканцы. Асабліва еўрапейцы. Слухайце, ну навошта вы ў Еўропе паставілі ў такое становішча сваіх людзей — французаў, немцаў і іншых. Ну навошта?! Ну давайце жыць мірна!»

«Аднойчы выказаў шалёную думку. Вось калі б вы, еўрапейцы, былі дружныя з намі, беларусамі, расіянамі, альянс быў эканамічна, фінансава, тэхналагічна, у ваенных адносінах непераможным. Мы б не ваявалі супраць каго б там ні было. Велізарныя рэсурсы, тэрыторыя на ўсходзе і найвышэйшыя тэхналогіі на захадзе ў вас, у немцаў і гэтак далей. Вось дзе ваша шчасце. Але вы не можаце гэтую палітыку праводзіць. Вам не даюць. Вось цяпер еўра абваліўся да ўзроўню долара. Амерыканцам ужо добра. Няўжо вы гэтага не бачыце? Вы ўсё бачыце, усё разумееце».

Аляксандр Лукашэнка заклікаў спыніцца, дамовіцца, скончыць «гэтую катавасію, аперацыю і вайну ва Украіне». «Давайце спынімся, а далей разбяромся, як жыць. Можа, прыйдзе час на нашым з вамі вяку, што людзі не будуць лічыць нават з граніцамі. Да гэтага ўсё ішло. Свабодна перамяшчаліся. Граніцы ўмоўнасцю былі. Таму давайце спынімся. Не трэба ісці далей. Далей бездань з ядзернай вайной. Не трэба да гэтага ісці».

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

Раман ГАЛОЎЧАНКА:

# «ДЛЯ РОСТУ ІНФЛЯЦЫІ НЯМА ПАДСТАЎ»



**Інфляцыя ў Беларусі запавольваецца, няма падстаў для яе росту. Аб гэтым паведаміў прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, перадае карэспандэнт БелТА.**

«Сапраўды, інфляцыя ў нас запавольваецца. Асабліва па харчовых таварах. Мы вельмі старанна сочым за гэтым, штодня аналізуем. Пакуль мы не бачым ніякіх падстаў для таго, каб інфляцыя ў краіне разганялася далей. Мы не ізаляваны ад сусветнай эканомікі, і ўсе выдаткі, якія ўзніклі з прычыны працэсаў, што адбываюцца вакол, не могуць не адбівацца на цэнах і ў нас», — сказаў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, напрыклад, у Турцыі інфляцыя цяпер складае каля 80 %. «Большую частку садавіны, агародніны мы імпартуем з гэтай краіны. Адпаведна, гэта не можа не перакладвацца на цану тавараў», — дадаў прэм'ер-міністр.

«Кошт перавозак у той жа Еўрасаюз павялічыўся ў пяць-шэсць разоў. Калі раней фура ў нямецкі або галандскі порт, адкуль мы забіраем тавар, каштавала 1-1,5 тысячы еўра, то цяпер даходзіць да дзесяці тысяч еўра. Натуральна, частка гэтых выдаткаў пераносіцца на кошт тавараў», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Урад прымае самыя жорсткія меры цанавога адміністравання, адзначыў ён. Калі б іх не было, сітуацыя з інфляцыяй была б іншай. «У нас усе сацыяльна значныя тавары вельмі жорстка кантралююцца. Пашыраны пералік нехарчовых тавараў, чаго раней увогуле не было», — расказаў прэм'ер-міністр.

Нядаўна ўрад сумесна з Камітэтам дзяржаўнага кантролю прыняў праграму па стабілізацыі цэн. «Некаторыя мерапрыемствы праграмы ўжо рэалізоўваюцца. Мы разлічваем, што з яе дапамогай рост цэн застанецца пад кантролем», — паведаміў Раман Галоўчанка.

«Інфляцыя б'е рэкорды па ўсім свеце. У суседняй Літве яна перавысіла 20 %, у Польшчы — 14-15 %. Гістарычныя максімумы ў еўразоне, ЗША. Гэта ўплывае на рост цэн і на інфляцыю ў Беларусі. Але мы ўсімі магчымымі і даступнымі спосабамі трымаем цэны. Я лічу, што меры, прынятыя ўрадам сумесна з Нацыянальным банкам, іншымі органамі, з'яўляюцца дастатковымі цяпер», — падкрэсліў кіраўнік урада.

Закранаючы яшчэ адну надзённую сёння тэму, Раман Галоўчанка адзначыў, што цукру ў краіне дастаткова, у найбліжэйшы час цэны на яго павышацца не будуць.

«Кожны год адбываецца разгон нейкіх чутак.Назіраецца ажыятаж, скупляюць цукар, а потым не ведаюць, куды яго дзяваць. Цяпер зноў на пустым месцы ўзнікла паніка. Мы летась атрымалі 530 тысяч тон цукру. З іх 370 тысяч тон пайшлі на ўнутраны рынак. Цяпер у нас 98 тысяч тон знаходзіцца на складах. І гэтага запасу дастаткова да новага ўраджаю», — сказаў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, Беларусь прытрымлівала экспартныя пастаўкі цукру. «Мы пайшлі на гэты крок, недаатрымалі выручку, але стварылі стабілізацыйны запас звыш неабходнага менавіта на выпадак розных панік. І цяпер, нават калі людзі прадоўжаць скупляць цукар вялікімі партыямі, яго ўсё роўна хопіць», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Кіраўнік урада звярнуў увагу, што цукар — не найлепшая інвестыцыя, яго спажыванне неабходна зніжаць. «Што датычыцца цаны, то яна не была павышана ні ў пачатку тыдня, ні ў канцы тыдня і не будзе павышана ні сёння, ні заўтра, ні ў найбліжэйшы час», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Кантэкст

# БРУДНЫЯ ГУЛЬНІ

## Ад справаздачы ІКАО патыхае непрыкрытай хлуснёй

**З'явіліся новыя падрабязнасці справаздачы ІКАО па інцыдэнце з рэйсам Ryanair. У эфіры тэлеканала АНТ нагадалі: удзел у пасяджэнні Савета ІКАО Беларусь брала па відэасувязі. Сярод пытанняў парадку дня — абмеркаванне справаздачы наконт інцыдэнту з рэйсам «Афіны — Вільнюс». Дакладчык — старшыня камісіі, якая займалася расследаваннем, Сільвіян Лафаер. Ён адразу заявіў: з'явіліся новыя факты, заснаваныя на паказаннях беларускага дыспетчара, пацверджаныя аўдыязапісамі. Як раней паведамлялася, у студзені ІКАО ўжо апублікавала справаздачу. І там адзначалася, што перахоплівання не было, лётчык самастойна вырашыў ляцець у Мінск, а Беларусь уважліва выканала ўсе неабходныя працэдуры. І раптам — новыя факты.**



### Шыта белымі ніткамі

Удзельнікам пасяджэння прадэманстравалі толькі некаторыя тэкставыя раздрукоўкі. Але сам аўдыязапіс раней публікавалі польскія спецслужбы. Адзін з галасоў, як сцвярджалася, належыць афіцэру беларускіх спецслужбаў. Але, як аказалася, гэта голас кіраўніка палётаў Яўгена Цыганова, непасрэднага начальніка дыспетчара, на чые паказанні спасылаецца Сільвіян Лафаер.

«Зразумела, гэта мой голас, — адзначае ў эфіры кіраўнік палётаў прадпрыемства «Белаэранавігацыя» Яўген Цыганоў. — Экіпаж вельмі шмат запытваў усялякай дадатковай інфармацыі, аб якой аператыўна сам дыспетчар мог і не ведаць. Тут умешваўся крыху я, ведаючы свае дакументы, абапіраючыся на іх, прымаў рашэнне. Прычым прымаў рашэнне ва ўзаемадзеянні са старшым дыспетчарам. Вядома, канчатковае рашэнне за мной».

Але старшыня камісіі заяўляе, што інструкцыі дыспетчару даваў не яго начальнік Яўген Цыганоў, а прадстаўнік КДБ. І ў расследаванні стаў фігураваць аўдыязапіс, які зрабіў дыспетчар і перадаў уладам Польшчы і ЗША. Як адзначылі ў эфіры АНТ, магчыма, запіс зрабіў дыспетчар Алег Галегаў, а пасля гэтага выехаў з Беларусі. «Савету павінна быць вядома, што ў дыспетчарскай зале пабочныя прадметы строга забароненыя, — звярнуў увагу прадстаўнік Расіі. — Адсюль вынікае, што дыспетчар у парушэнне правілаў загадзя пранёс забаронены прадмет з уключаным дыктафонам. Акрамя таго, замест выканання сваіх абавязкаў ён нібыта падслухоўваў размовы. Даючы паказанні ў Польшчы і ЗША, ці не знаходзіўся гэты чалавек пад ціскам спецслужбаў гэтых краін?»

«Што з гэтым чалавекам? Гэта наогул той чалавек, які ў нас працаваў? Ці гэта нейкі новы чалавек? Скажыце імя, пакажыце інтэрв'ю, відэа, гутарку ці яшчэ нешта. А калі мы ў іх пытаем: вы праверылі запіс на дакладнасць? І цішыня», — падкрэсліў дырэктар дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Арцём Сікорскі.

Пры гэтым знішчаны аўдыязапіс перагавораў экіпажа. І на гэта таксама звярнулі ўвагу савета. А такая інфармацыя вельмі важная, каб паказаць логіку, якой кіраваўся камандзір паветранага судна. Знішчаць запіс пілоты не мелі права, — гэта супярэчыць правілам. Запіс важны, каб пацвердзіць, што ўсё гэта правакацыя з мэтай увядзення санкцый і абмеркаванняў. Самалёт яшчэ знаходзіўся ў паветры, а розныя інфармацыйныя рэсурсы, якія кантралююцца польскім урадам, ужо інфармавалі, што затрыманы адзін з пасажыраў рэйса.

### Следства працягваецца

Следчы камітэт Беларусі працягвае расследаванне справы аб прымусовай пасадцы самалёта авіякампаніі Ryanair у мінскім аэрапорце ў маі мінулага года, за мяжу накіравана больш за дзесяці запытаў, але дапамогі ў расследаванні Мінск не атрымлівае, заявіў афіцыйны прадстаўнік СК Сяргей Кабаковіч. «Варта адзначыць, што гэта не адзінкавы выпадак электроннага тэрарызму на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. У следчых ужо даўно вызначаны алгарытм работы па дадзеных фактах. Па кожнай без выключэння крымінальнай справе накіроўваецца даручэнне або просьба аб аказанні міжнароднай прававой дапамогі з мэтай устанаўлення асоб, якія маюць дачыненне да ўчынення злачынства», — заўважыў Сяргей Кабаковіч. Прадстаўнік СК адзначыў, што з пачатку 2021-га ў Беларусі распачата звыш 585 крымінальных спраў аб ілжывым мініраванні больш чым 5000 аб'ектаў інфраструктуры ў Беларусі, у тым ліку звыш 20 спраў па фактах «мініравання» Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» і бартоў самалётаў.

І здарэнне з самалётам авіякампаніі Ryanair, паводле слоў Сяргея Кабаковіча, «не стала выключэннем, па справе накіравана больш за дзясятак запытаў і просьбаў за мяжу, у такія краіны, як Польшча, Літва, ЗША, Ірландыя, Ізраіль і г. д.». «Аднак адказу на іх мы так і не атрымалі да гэтага часу», — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік СК. Устаноўлена, што паведамленні аб мініраванні самалёта Ryanair паступілі з дапамогай швейцарскага паштовага сэрвісу Proton Mail. «Туды таксама быў накіраваны міжнародны запыт аб асобе, якая ўчыніла гэтае злачынства. Варта адзначыць, што ўказаны паштовы сэрвіс ужо неаднаразова фігураваў у крымінальных справах аб пагрозе ўчынення тэрактаў і выбухаў на розных аб'ектах інфраструктуры ў Беларусі. Аднак усе прававыя запыты нашай краіны аб тэрарыстычных пагрозах, якія перасылаюцца праз гэты паштовы сэрвіс, застаюцца без адказу і дагэтуль», — заўважыў афіцыйны прадстаўнік СК.

Разам з тым беларускі бок валодае дакладнай інфармацыяй, што звесткі аб інцыдэнце даваліся праз Літву ад Швейцарыі ў адрас ІКАО. «Нас як орган папярэдняга следства, у вытворчасці якога знаходзіцца гэтая крымінальная справа, як мінімум абурае, што ў краін калектыўнага Захаду існаваў і працягвае існаваць выбарачны падыход па прадстаўленні інфармацыі. Больш за тое, швейцарскі бок паведаміў аб прыпыненні супрацоўніцтва з нашай краінай у кантэксце ўзаемнай прававой дапамогі па крымінальных справах», — адзначыў Сяргей Кабаковіч. Беларусь, паводле яго слоў, зацікаўлена ў бесстароннім расследаванні справы і па-ранейшаму адкрытая да ўзаемадзеяння з замежнымі партнёрамі.

### Без фактаў і доказаў

У выпадку з падзеяй у небе Беларусі фактаў, доказаў і сведак няма, але тэндэнцыйнае рашэнне ёсць, канстатавалі ў эфіры АНТ. Расшыфроўкі нейкіх перагавораў хапіла, каб абвінаваціць Беларусь. У савет уваходзяць 36 краін. Нас падтрымалі Расія, ПАР, Індыя, Кот-д'Івуар. Калі ж справа дайшла да таго, каб разгледзець скаргу нашай краіны на паветраную блакаду, — здарылася нечаканае. Прэзідэнт ІКАО вырашыў перанесці разгляд пытання на месяц. Афіцыйная прычына — з-за стомленасці перакладчыкаў.

«Перакладчыкі стаміліся, кажуць. Добра, кажу, давайце буду весці па-англійску. Пачынаецца, кажуць, што французы не разумеюць. У нас ёсць розніца ў часе з Манрэалем. Як правіла, раней яны стараліся планаваць усе мерапрыемствы, каб па беларускім часе яны пачыналіся ў 2 гадзіны ночы. А потым раніцай паведамлялі, што ўсе стаміліся, таму да беларускага пытання не падышлі. Давайце мы яго перанясём», — згадаў Арцём Сікорскі.

Адпачываць перакладчыкі ІКАО будуць да 24 жніўня — на гэту дату перанесена абмеркаванне скаргі Беларусі на паветраную блакаду. «Далей Беларусь вынесе абмеркаванне дзеянняў камісіі ІКАО на пасяджэнне Асамблеі арганізацыі. У яе ўваходзяць прадстаўнікі ўсіх дзяржаў — членаў арганізацыі, — паведамілі на АНТ. — Гэта 193 краіны, якія змогуць пераканацца ў тэндэнцыйнасці і ангажаванасці справаздачы, выпраўленай дзеля інтарэсаў некалькіх краін».

**Пётр ДУНЬКО.**

Даслоўна

## «ГЭТА ФАЛЬСІФІКАЦЫЯ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назваў справаздачу ІКАО наконт інцыдэнту з рэйсам Ryanair фальсіфікаванай. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў у інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Франс Прэс».

«Гэта фальсіфікацыя», — сказаў Прэзідэнт наконт нядаўняй справаздачы ІКАО. Беларускі бок ужо даў сваю ацэнку гэтаму дакументу. «І чаму гэта заключэнне ІКАО менавіта сёння або ўчора з'явілася? Якое права ІКАО мае накладаць санкцыі? Або Францыя? Якое вы маеце права? Гэта права Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Дык нават рэкамендацыі такой не было», — заявіў беларускі лідар.

Ён звярнуў увагу, што санкцыі ў адносінах да Беларусі па закрыцці паветранай прасторы былі ўведзены еўрапейскімі краінамі яшчэ да з'яўлення якіх-небудзь дакументаў або справаздач: «Вы ж санкцыі ўвялі супраць кампаніі «Белавія» яшчэ два гады таму, без падстаў для гэтага. Вы на другі дзень усе ў адзін голас, пачынаючы ад Макрона і заканчваючы канцлерам Германіі Меркель, па ўказцы Вашынгтона пачалі крычаць: «Злачынцы, такія-сякія!» Вы яшчэ фактаў на стале не мелі».

У той жа час значна больш сур'ёзны інцыдэнт з інданезійскім самалётам, збітым у небе над Украінай, расследуецца да гэтага часу, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Дзе рэзультат? Дык там колькі людзей загінула», — спытаў Прэзідэнт.

А што датычыцца Рамана Пратасевіча, які знаходзіўся на борце самалёта Ryanair, то ён, паводле слоў Прэзідэнта, спакойна жыве ў сваёй краіне і не хоча на Захад.

Беражыце сябе

# Кіраванне без траўмаў

## Што ў хуткім часе чакае карыстальнікаў электрасамакатаў?

**Гэты від транспарту ўжо трывала ўвайшоў у наша жыццё і стаў яго неад'емнай часткай. На ім ліха ганяюць як дзеці, так і дарослыя. Апошнія, дарэчы, выкарыстоўваюць электрасамакаты як сродак перамяшчэння. Нярэдка ў летні перыяд на іх перасаджваюцца і аўтааматычна... дальнікі. Толькі не ўсе валодаюць правіламі бяспечнага кіравання — на жаль, не абыходзіцца без траўмаў.**

Якія парушэнні падчас дарожнага руху здзяйсняюць самакатчыкі, да чаго прыводзіць ліхацтва на дарозе і калі, нарэшце, уступяць у сілу змяненні ў Правілы дарожнага руху, дзе ўпершыню прапісаны патрабаванні да кіроўцаў электрасамакатаў, карэспандэнты «Звязды» даведаліся ў супрацоўнікаў Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі. Разам з інспектарамі мы прайшліся па мінскіх вуліцах і паназіралі, як паводзяць сябе карыстальнікі электрасамакатаў. Не абышлося без цікавых высноў і карысных рэкамендацый.

### ПА ПРАВІЛАХ ПЕШАХОДАЎ

Веласіпедысты і пешаходы паранейшаму застаюцца найбольш уразлівымі ўдзельнікамі дарожнага руху. Пачасціліся выпадкі траўматызму людзей, якія перамяшчаюцца на электрасамакатах, сегвэях, гіраскутарах, манаколах і іншым электратранспарце — неўзабаве іх усіх будуць называць сродкамі персанальнай мабільнасці. Новая рэдакцыя Правілаў дарожнага руху ўступае ў сілу ўжо гэтай восенню, 27 кастрычніка, — адпаведны ўказ у красавіку быў падпісаны кіраўніком дзяржавы.

Як паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, дакумент прыняты з мэтай павышэння культуры ўдзельнікаў дарожнага руху, стымулявання выкарыстання электратранспарту і зніжэння колькасці дарожна-транспартных здарэнняў. Прадугледжаныя ўказам меры павысяць бяспеку на дарогах і зробяць удзел у дарожным руху больш зручным і камфортным для грамадзян.

Што датычыцца электрасамакатаў і іншых сродкаў персанальнай мабільнасці, як іх прынята будзе называць, перамяшчацца на іх можна будзе па веласіпеднай дарожцы. Пры яе адсутнасці — па тратуары, пешаходнай дарожцы ці абочыне. Выкарыстоўваць сродкі персанальнай мабільнасці, за выключэннем жылых і пешаходных зон, змогуць асобы, якія дасягнулі 14-гадовага ўзросту. Рухацца на электратранспарце трэба будзе з хуткасцю веласіпеда — не больш як 25 км/г. Забаронена перамяшчацца на ім у стане алкагольнага ап'янення, перавозіць пасажыраў, калі апошняе не прадугледжана канструкцыяй.

Як расказвае **старшы інспектар па асаблівых даручэннях галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС падпалкоўнік міліцыі Аляксандр БРУЙ**, змяненні ў Правілы дарожнага руху, звязаныя з электратранспартам, абумоўленыя з'яўленнем новага віду перамяшчэння. Супрацоўнік органаў унутраных спраў кажа, што ўсё заканамерна, і прыводзіць як прыклад змяненні ў ПДР, выкліканыя ў свой час масавым выкарыстаннем за рулём мабільных тэлефонаў. У выніку забарона размоў па тэлефоне падчас руху на аўтамабілі паўплывала на зніжэнне аварыйнасці з прычыны няўважлівасці.

— Апошнім часам пешаходы актыўна перамяшчаюцца на сродках персанальнай мабільнасці, якія не каштуюць вялікіх грошай, таму даступныя амаль для кожнага, — працягвае Аляксандр Бруй. — Адпаведна, з'явілася новая катэгорыя ўдзельнікаў дарожнага руху, якая ні пад якую існуючую катэгорыю не траплялa. Прыйшлося ўвесці новае паняцце «сродак персанальнай мабільнасці», пад якім маецца на ўвазе прыстасаванне або прылада, пры дапамозе якога перамяшчаюцца пешыя ўдзельнікі дарожнага руху. Неўзабаве яны няўхільна павінны будуць выконваць Правілы дарожнага руху, якія распаўсюджваюцца на пешаходаў.

### ДУМАЦЬ ПРА СЯБЕ І НАВАКОЛЬНЫХ

Безумоўна, карысць ад выкарыстання электрасамакатаў відавочная. Гэта і экалагічны аспект — шкоду навакольнаму асяроддзю такі від транспарту не прыносіць. І для здароўя часам нядрэнна калі не поўнасцю перасесці на электрасамакат, дык хоць раз-пораз на ім пакатацца, асабліва на свежым паветры. Аднак галоўнае, на што пры гэтым варта звярнуць увагу, — бяспека як уласная, так і навакольных.

Бяспечнае перамяшчэнне карыстальнікаў электратранспарту на тэрыторыі Мінска і ўсёй краіны кантралююць супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі. Праводзяць яны і вялікую прафілактычную работу з насельніцтвам — актыўныя карыстальнікі персанальных сродкаў мабільнасці, у першую чаргу моладзь, павінны быць падрыхтаваныя да навоўвядзенняў, якія іх неўзабаве чакаюць.

— Выкарыстоўваючы электрасамакаты, у першую чаргу трэба быць уважлівымі, — падкрэслівае **начальнік аддзялення галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС капітан міліцыі Вераніка РАМАНЬКОВА.** — Рэкамендуецца надзяваць шлем. Калі перамяшчаецеся ў цёмны час сутак, абавязкова абсталёўвайце сябе святлоадбівальнымі элементамі, каб цябе ўбачылі як пешаходы, так і веласіпедысты. І на тэрыторыі Мінска, і ў іншых гарадах ёсць месцы, дзе неабходна зніжаць хуткасны рэжым. Выкарыстоўваючы электрасамакаты, памятайце аб тым, што калі вы рухаецеся па тратуары, пешаходнай дарожцы або веладарожцы, вы там знаходзіцеся не адны — там ёсць яшчэ такія ж удзельнікі дарожнага руху, як і вы: веласіпедысты і, вядома, пешаходы, якія заслугоўваюць асаблівай увагі.

Дзяржаўтаінспекцыя трымае на кантролі і абвастрэнне дарожнага траўматызму. Фіксуюцца асобныя выпадкі пападання ў дарожна-транспартныя здарэнні грамадзян, якія ў сваёй штодзённай жыццядзейнасці выкарыстоўваюць электрасамакаты. Вераніка Раманькова расказвае, што найбольш траўмаў па віне электрасамакатчыкаў адбываецца з-за іх жа няўважлівасці. «Часам узнікае канфлікт з кіроўцамі аўтамабіляў, — тлумачыць супрацоўніца ДАІ. — У прыватнасці, на пешаходным пераходзе грамадзянін, які выкарыстоўвае электрасамакат, не заўсёды зніжае хуткасць. І з-за таго, што ён рэзка можа з'явіцца на праезнай частцы, можа адбыцца дарожна-транспартнае здарэнне. Часам бываюць выпадкі, калі ў небяспечныя сітуацыі трапляюць самі пешаходы. Тут, безумоўна, важная ўвага як адных, так і другіх». У той жа час, заўважаюць у міліцыі, культура паводзін людзей на дарозе павысілася. Аднак над гэтым пастаянна трэба працаваць.

### АДЗІН САМАКАТ — АДЗІН ЧАЛАВЕК

Сапраўды, сёння шмат хто можа сабе дазволіць мець электрасамакат. Тыя, каму гэта не па сілах або калі з прычыны нячастага выкарыстання такой неабходнасці няма, звяртаюцца да паслуг каршэрынгу. Узяць у арэнду электрасамакат можна ў любы час і практычна ў любым месцы — ва ўсякім разе, у Мінску гэты двухколавы транспарт можна сустрэць на кожным кроку. Аднак ці не ўплывае такая даступнасць электрасамакатаў на бяспеку дарожнага руху?

Аб гэтым мы пагаварылі з прадстаўніком адной з каршэрынгавых кампаній. У Мінску яны працуюць усяго месяц, але пэўныя высновы зрабіць ужо могуць. Ва ўласнасці каршэрынгу — дзве тысячы самакатаў. Усе яны — пад кантролем кампаніі.

**Дырэктар па камунікацыях каршэрынгу Юлія КАМОЙЛІК** адзначае, што Мінск — цудоўны горад, па якім хочацца гуляць. «Аднак ёсць пэўныя транспартныя задачы: напрыклад, даехаць да офіса, спартзалы ці кудысьці яшчэ, якія рэалізоўваюцца ў тым ліку на самакаце, — кажа яна. — Многія ў летні перыяд нават перастаюць карыстацца аўтамабілем, каб больш часу праводзіць на свежым паветры. 80 працэнтаў паездак на нашых электрасамакатах ажыццяўляецца па транспартным сцэнарыі, дзеля прагулачных мэт — толькі 20 працэнтаў».

Прадстаўнікі каршэрынгу заўважаюць, што са з'яўленнем электрасамакатаў машын у горадзе стала крыху менш. Ад гэтага, безумоўна, чысцейшым становіцца паветра і лепш адчуваюць сябе людзі, асабліва калі ўлічыць, што паездкі на самакаце звязаныя з прыемнымі эмоцыямі. «Пры гэтым мы шмат зрабілі для таго, каб самакат быў бяспечным, — адзначае Юлія Камойлік. — Усе дзве тысячы самакатаў настроеныя ў нас аднолькава, мы кіруем імі аддалена. Хуткасць у нашых самакатаў абмежаваная, у вячэрні час абавязкова спрацоўвае фара».

Клапоцяцца прадстаўнікі каршэрынгу і аб этыцы паводзін самакатчыкаў на дарозе, аб выкананні імі Правілаў дарожнага руху. Пад эгідай кампаніі нядаўна працавала Школа бяспечнага кіравання, дзе кожны мог атрымаць бясплатную кансультацыю па бяспечным кіраванні электрасамакатам. Таксама ў дапамогу кіроўцам самакатаў каршэрынгавай кампаніяй створаны мабільны дадатак, які даступны і для нашых карыстальнікаў. Гэтым яны хочуць сказаць, што ў самакатаў правілы ёсць, яны простыя і іх нескладана выконваць. Калі правілы парушаюцца, для карыстальнікаў электратранспарту прадугледжаны штраф: напрыклад, за перадачу самаката дзіцяці або за перамяшчэнне на ім дваіх чалавек. Усё гэта фіксуецца.

— Насамрэч, большасць людзей выконвае правілы, — звяртае ўвагу Юлія Камойлік. — Тых прычын, якія прыводзяць да траўматызму, не так шмат. Напрыклад, нельга практыкаваць паездкі ўдваіх, асабліва калі сярод пасажыраў — дзеці. У самаката — невялікае кола, любая няроўнасць выклікае хістанне. Калі на ім знаходзяцца два чалавекі, то хіснуць можа мацней і пасажыры могуць упасці. Таму адзін самакат — адзін чалавек. І гэта заўсёды дарослы чалавек.

Яшчэ адна з прычын, з якой чалавек на электрасамакаце можа атрымаць траўму, звязана з няправільным перасячэннем пешаходных пераходаў. Асабліва гэта небяспечна, калі чалавек, што едзе на самакаце, не злазіць з яго — няважна, перасякае ён праезную частку на пешаходным пераходзе, які рэгулюецца, або не. Гэта пагражае сустрэчай з аўтамабілем. Каб пазбегнуць непрыемнасцяў, пры перамяшчэнні праз пешаходны пераход самакат неабходна каціць побач.

Прадстаўнік каршэрынгу адзначае, што за месяц, пакуль яны працуюць у Мінску, траўмаў з іх электрасамакатамі не зафіксавана. Яны мяркуюць, што ў гэтым заслуга горада — у сталіцы шырокія тратуары і вялікая колькасць веладарожак, пры правільным выкарыстанні якіх аварыйнасць мінімальная. Поўнасцю пазбегнуць траўматызму або звесці яго да выключных выпадкаў, безумоўна, дазволяць змяненні ў Правілы дарожнага руху, якія, нагадваем, увойдуць у дзеянне ўжо гэтай восенню.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**








# АДЗІН ЗАПЫТ — ДВАНАЦЦАЦЬ АДКАЗАЎ

## СУПЕРСЭРВІС І ПАДКАЗКА АД ДЗЯРЖАВЫ

Сэрвісы на АПЭП прадстаўлены ў самых розных галінах: нерухомасць, адукацыя, медыцына, падаткі, фінансы, гандаль і іншае. Цяпер можна атрымаць каля 20 сэрвісаў — электронных паслуг і адміністрацыйных працэдур. Іх колькасць залежыць ад ліку баз даных, якія інтэграваны з інфармацыйнымі сістэмамі цэнтра. Штодня на партал звяртаюцца па аказанне каля 100 тысяч электронных паслуг і каля 200 адміністрацыйных працэдур.

— Уся інфармацыя захоўваецца менавіта ў базах пэўных арганізацый (пастаўшчыкоў паслуг), а не на партале АПЭП. Наша задача як аператара — наладзіць механізм узаемадзеяння паміж імі, стварыць інфраструктуру, каб грамадзяне маглі ўвайсці ў сістэму і атрымаць пэўную паслугу. То-бок мы настройваем прыгожыя зручныя «рэйкі» і падтрымліваем іх у працаздольным стане, а «вагоны», якія па іх ездзяць, належаць не нам, а аператарам, што валодаюць звесткамі. Чым больш будзе «вагонаў», тым больш інфармацыі зможа атрымаць беларус, — падкрэсліла **Святлана КАРАНЕВІЧ, начальнік аддзела электронай камерцыі НЦЭП.**

Запыт у адну базу даных — гэта адна паслуга. А прадастаўленне нейкай інфармацыі на падставе звестак з некалькіх баз даных — ужо паслуга комплексная. Існуе яшчэ такое паняцце, як «суперсэрвіс» — набор сэрвісаў, якія ўключаюць у сябе комплексныя паслугі пры наступленні нейкай жыццёвай сітуацыі.

Паняцце «праактыўныя паслугі» азначае, што калі ў чалавека наступіла нейкая жыццёвая сітуацыя, ён нічога не робіць (ніякіх запытаў). Дзяржава сама ведае, што ў грамадзяніна склаліся пэўныя абставіны (пераезд на новае месца жыхарства, ДТЗ), таму што звесткі пра гэта паступаюць у розныя базы даных і інфармацыйныя рэсурсы. І калі такая сітуацыя настае, аператары самі накіроўваюць у асабісты кабінет чалавека інфармацыю, што яму ў сувязі з пэўнымі абставінамі прызначана, напрыклад, дапамога. Або яму належыць звярнуцца ў пэўную арганізацыю, каб напісаць нейкую заяву.

— Такім чынам дзяржава падказвае асобе, што трэба зрабіць, папярэджвае зварот да яе чалавека, — растлумачыла Святлана Караневіч. — Дзейнічае не заяўны прынцып, калі чалавек просіць нешта ў дзяржавы, а дзяржава сама нагадвае, што яму трэба.

## АДРАСНАЯ ДАПАМОГА, НЕРУХОМАСЦЬ, ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ...

Цяпер для фізічных асоб на АПЭП прапануецца каля 50 розных паслуг, аднак спецыялісты пастаянна працуюць над распрацоўкай новых, у тым ліку і комплексных, і суперсэрвісаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




Існуе шмат паслуг, якія датычацца нерухомасці. Чалавек можа даведацца пра свае правы на зямельны ўчастак, капітальныя збудаванні, будынкі, незавершаныя рамонтам, закансерваваныя і ізаляваныя пабудовы (кватэры). Людзі могуць даведацца, якой нерухомасцю яны валодаюць ці калісьці валодалі, што адчуждалі на карысць кагосьці. Для атрымання ўсіх гэтых звестак аператар, які іх прадастаўляе, патрабуе ад чалавека выкарыстаць свой электронны лічбавы подпіс (ЭЛП) ці ID-картку, падкрэсліла спецыяліст:

— З дапамогай ЭЛП можна даведацца інфармацыю пра памер дапамогі на дзіця, пра дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу (калі агульны даход сям'і ніжэйшы за ўзровень пражытачнага мінімуму, ёй належыць грашовая дапамога: на падгузкі, харчаванне, аплату камунальных паслуг). Можна паглядзець таксама звесткі аб наяўнасці ці адсутнасці запазычанасці індывідуальнага прадпрымальніка ці фізічнай асобы перад бюджэтам. Праверыць, ці знаходзішся ты ў базе дармаедаў. Можна даведацца, і якія выплаты плаціць наймальнік за цябе як работніка ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Адносна новая паслуга датычыцца перасячэння граніцы — на АПЭП чалавек можна даведацца, калі яго не было ў краіне. За большасць гэтых паслуг прыйдзецца сімвалічна заплаціць (да рубля).

## ПРАВЕРКА ДЗЕЛАВОЙ РЭПУТАЦЫІ

На партале пакуль ёсць адзін комплексны сэрвіс — праверка добрасумленнасці дзелавой рэпутацыі, калі на адзін запыт чалавека прыйдуць адказы адразу з дванаццаці баз даных.

— Уявім, што чалавек хоча заказаць рамонт і дызайн кватэры. Ён збіраецца заключыць дагавор з фірмай, але не мае ўяўлення, наколькі яна надзейная як контрагент. За 84 капейкі на партале можна праверыць, ці не банкрут арганізацыя, ці не мае даўгоў, ці прыстойна працуе і іншае, адправіўшы запыт на праверку яе дзелавой рэпутацыі адразу ў некалькі баз. Такая магчымасць даступная і ў дачыненні, напрыклад, кампаній, якія аказваюць клінінгавыя або медыцынскія паслугі, — паясніла спецыяліст. — Не лішнім будзе праверыць і стан турыстычнай кампаніі, якой вы збіраецеся даверыць арганізацыю свайго адпачынку.

Комплексная паслуга «Звесткі для праверкі добрасумленнасці дзелавой рэпутацыі» дазваляе атрымаць інфармацыю аб кампаніі ажно па 12 напрамках. Гэта таксама агульныя даныя аб суб'екце гаспадарання: яго поўнае і скарочанае найменне, тып суб'екта гаспадарання, бягучы стан, дата рэгістрацыі і выключэння з Адзінага дзяржаўнага рэгістра (спыненне дзеяння суб'екта ў сувязі з рэарганізацыяй).

Можна даведацца і дату пастаноўкі кампаніі на ўлік у падатковы орган, код і найменне падатковага органа па месцы пастаноўкі плацельшчыка на ўлік, а таксама найменне стану плацельшчыка і дату яго пераходу ў гэты стан. Праверыць інфармацыю аб наяўнасці ці адсутнасці запазычанасці перад бюджэтам або паглядзець звесткі па справах аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве) з указаннем нумара справы і даты яе падачы ў эканамічны суд, наймення і адраса заяўніка і даты вынясення працэсуальнага дзеяння.

Дзякуючы такой паслузе можна атрымаць звесткі пра банкруцтва арганізацыі. У гэтым выпадку будуць даступныя найменне заяўніка і суда, нумар справы і дата падачы заявы ў эканамічны суд. А таксама найменне даўжніка, яго адрас і назва ці прозвішча кіраўніка, яго адрас і нумар тэлефона, найменне працэсуальнага дзеяння і дата яго вынясення.

Можна ўбачыць і інфармацыю аб разглядзе заяў у парадку загаднага вядзення: адрас даўжніка, найменне яго і суда, нумар справы, дату падачы заявы ў эканамічны суд, суму спагнання, УНП даўжніка, найменне працэсуальнага дзеяння і дату яго вынясення.

Акрамя таго, даступнымі будуць звесткі аб відах падаткаў арганізацыі, збораў (пошлін) і асаблівых рэжымах падаткаабкладання (інфармацыя аб падатковых дэкларацыях і адзнакі аб спецыяльных рэжымах падаткаабкладання за мінулы і бягучы гады), інфармацыя пра колькасць работнікаў (за мінулы і бягучы гады), звесткі гадавой бухгалтарскай і фінансавай справаздачнасці (у выглядзе электронных файлаў PDF) з бухгалтарскім балансам, справаздачай пра прыбытак і страты, справаздачай пра рух сродкаў, пра мэтавае фінансаванне (за папярэдні год).

Інфармацыя пра ўключэнне суб'екта гаспадарання ў Рэестр камерцыйных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў з павышаным рызыкай здзяйснення правапарушэнняў у эканамічнай сферы (дата ўнясення ў рэестр і падстава для гэтага) таксама будзе прадастаўлена. Гэтак жа, як і звесткі пра ўключэнне арганізацыі ў План выбарачных праверак, што фарміруецца Камітэтам дзяржкантролю (дзяржорган, які зацвердзіў план праверак, УНП кантрольнага органа і яго найменне, месяц пачатку праверкі).

**Ірына СІДАРОК.**

---

Будзьце пільныя

# Тэлефоннымі званкамі аб «дапамозе» часцей за ўсё ўдаецца падмануць пажылых людзей

**Чарговай ахвярай ашуканцаў стала пенсіянерка з Мінска. За «выратаванне» сына яна аддала 37 тысяч долараў ЗША**

Як паведаміла **афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па г. Мінску Кацярына ГАРЛІНСКАЯ,** паводле звестак следства, днём 19 ліпеня жыхарцы сталіцы патэлефанавала жанчына. Суразмоўніца назвалася следчым і паведаміла страшную навіну: сын мінчанкі нібыта стаў вінаватым у сур'ёзным дарожна-транспартным здарэнні. Для большай пераканаўчасці, ілжэследчая расказала, што па віне мужчыны пацярпела маладая дзяўчына і цяпер яна ў цяжкім стане знаходзіцца ў бальніцы. Падчас дыялогу суразмоўніца дадала, што для «вырашэння пытання» аб адмове ў распачынанні крымінальнай справы ў дачыненні да сына пенсіянеркі трэба перадаць 15 тысяч долараў ЗША.

Напалоханая жыхарка сталіцы вельмі хацела дапамагчы сыну і сказала, што перадасць неабходную суму. Праз некаторы час да яе дадому прыехаў мужчына і забраў грошы. Што характэрна, увесь гэты час ілжэследчая была на сувязі з пенсіянеркай.

Але зламыснікі не спыніліся і прыдумалі новую гісторыю. Суразмоўніца расказала мінчанцы, што на аперацыю яе сыну таксама патрэбныя грошы — гэтым разам 22 тысячы долараў ЗША. Пенсіянерка пагадзілася і на такую ўмову махляроў. І зноў прыехаў кур'ер ад «следчага» і забраў грошы.

Ілжэследчая таксама сказала пенсіянерцы выйсці на вуліцу і чакаць службовы аўтамабіль: маўляў, яе завязуць да сына ў бальніцу. Жанчына паслухмяна выканала ўсе патрабаванні, а выйшаўшы з пад'езда, сустрэла знаёмага свайго сына, які і сказаў пенсіянерцы, што з тым усё добра. Пацярпелая зразумела, што яе падманулі, і звярнулася ў праваахоўныя органы.

Варта адзначыць, што па тэлефоне са зламыснiцай занепакоеная маці размаўляла больш за 5 гадзін.

Па дадзеным факце Маскоўскім (горада Мінска) раённым аддзелам Следчага камітэта распачата крымінальная справа па ч. 4 арт. 209 (махлярства, учыненае ў асабліва буйным памеры) Крымінальнага кодэкса краіны. Цяпер праводзяцца следчыя дзеянні і аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, накіраваныя на ўстанаўленне асоб, якія маюць дачыненне да ўчынення злачынства.

Як ужо неаднаразова гаварылася, тэлефоннымі званкамі аб дапамозе часцей за ўсё ўдаецца падмануць пажылых людзей — з прычыны ўзросту і павышанай даверлівасці пенсіянеры паддаюцца падману больш за іншых грамадзян. Таму Следчы камітэт у чарговы раз настойліва рэкамендуе папярэдзіць сваіх пажылых сваякоў аб тэлефонных ашуканцах. Раскажыце, як правільна паступіць і не страціць зберажэнні.

---

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Узровень інфляцыі ў Вялікабрытаніі стаў найвышэйшым за апошнія 40 гадоў

За чэрвень узровень інфляцыі ў Вялікабрытаніі павялічыўся да 9,4 працэнта ў гадавым выражэнні, паведаміла Нацыянальная статыстычная служба Злучанага Каралеўства. Галоўнай прычынай росту цэн з'яўляецца рэзкі скачок кошту паліва і электраэнергіі з-за энергетычнага крызісу ў Еўропе. Кошт бензіну ў Вялікабрытаніі за год павялічыўся на 40 працэнтаў, электраэнергія падаражэла на 54 працэнты. Выдаткі прамысловых прадпрыемстваў павялічыліся на 24 працэнты, што лічыцца найвышэйшым паказчыкам з таго моманту, як гэтая статыстыка пачала весціся. Паводле папярэдніх прагнозаў Банка Англіі, да восені ўзровень інфляцыі ў краіне можа вырасці да 11 працэнтаў. У такім выпадку жыхары Вялікабрытаніі могуць сутыкнуцца з самым істотным падзеннем узроўню жыцця за апошнія 70 гадоў.

## Прэзідэнт Італіі прыняў адстаўку прэм'ер-міністра і распусціў парламент



Серджа Матарэла нарэшце прыняў адстаўку Марыа Драгі, паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на заяву канцылярыі прэзідэнта. Кіраўнік італьянскага Кабміна заявіў аб жаданні пакінуць прэм'ерскую пасаду яшчэ на мінулым тыдні. Аднак тады Матарэла не прыняў адстаўку Драгі. 21 ліпеня прэм'ер паўторна звярнуўся да прэзідэнта Італіі з прашэннем аб адстаўцы. У выніку Матарэла прыняў да ўвагі просьбу Драгі і даручыў ураду выконваць бягучыя абавязкі. Раней Драгі заяўляў, што не бачыць для сябе ўмоў для работы на пасадзе прэм'ера. Такая сітуацыя склалася з-за ўнутрыпалітычных рознагалоссяў.

## У ЗША давер да СМІ упаў да рэкордна нізкага ўзроўню

Давер жыхароў Злучаных Штатаў да матэрыялаў, якія публікуюцца ў СМІ, знаходзіцца на рэкордна нізкім узроўні за ўсю гісторыю даследаванняў у галіне. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на даныя апытання амерыканскага Інстытута Гэлапа. Паводле апытання, толькі 16 працэнтаў рэспандэнтаў перакана违ыя, што атрымліваюць праўдзівую інфармацыю з газет, і толькі 11 працэнтаў амерыканцаў давяраюць навінам, паказаным па тэлебачанні. Паводле даных Інстытута Гэлапа, такога нізкага ўзроўню даверу да СМІ у ЗША яшчэ не фіксавалася. Летась абодва паказчыкі былі на пяць працэнтаў вышэйшыя, чым сёлета. Як вядома, узровень даверу да газет у ЗША ацэньваецца Інстытутам Гэлапа з 1973 года, да тэлебачання — з 1992-га.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by** |
| Предмет электронных торгов – **1/2 доля в праве на изолированное помещение № 1 (торговое помещение)**, инвентарный номер 100/D-81249, общая площадь помещения 283,3 кв. м. Местоположение: **г. Брест, ул. Ясеневая, 6** | **Начальная цена с НДС 20 % – 95 322,79 бел. руб.** |

**Сведения о земельном участке 140100000001007697: предоставлен на праве долевой аренды (1/6 доля) по 18.11.2053 для строительства и обслуживания мини-пекарни с магазином**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих** дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **5** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 0,6 % от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Передача предмета аукциона победителю торгов (единственному участнику), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости имущества.
Победителю торгов (единственному участнику) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины; с государственной регистрацией автомобиля несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: в 11.00 24.08.2022 до 12.00 24.08.2022.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок: по 22.08.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

---

Печать, свидетельство о государственной регистрации № 01-0087 и Устав Лунинецкого районного общественного объединения «Футбольный клуб «Гранит» **считать недействительными в связи с утерей.** УНП 200505002

---

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «ВЗЭП», 210630, г. Витебск, ул. Ильинского, 19/18** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| Наименование | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|
| **СКЛАД** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), общей площадью 487, кв. м, инвентарный номер: 200/С-78931, по адресу: г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/2 | **402 041,44** бел. руб. |

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 240100000001000169:** пл. 3,1357 га предоставлен на праве общей долевой аренды (доля 5/8) по 10.04.2065 г. содержания и обслуживания производственных помещений

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 15 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 25.08.2022**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 23.08.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Ремонтно-реставрационный филиал ОАО «Минскремстрой», г. Минск, ул. Багратиона, д. 62, 3-й этаж** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов** – транспортные средства, бывшие в употреблении. Местонахождение: г. Минск, ул. Багратиона, 62

| Лот, № | Марка, модель | Год выпуска | Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **1** | **Автомобиль GAZ-33021 AT 6855-7** | 2003 | **2 520,00** |
| **2** | **Автомобиль GAZ-3300202 AT 0260-7** | 2007 | **1 920,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** после проведения торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 10 % от цены продажи предмета торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 29.08.2022 в 11.00. Окончание торгов: 29.08.2022 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 26.08.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

---

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Управление СтройМеханизации», 220075, г. Минск, ул. Промышленная, 23, пом. 23** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

Предмет электронного аукциона:
**незавершенное законсервированное капитальное строение** (здание неустановленного назначения), инв. № **714/U-33729**, общ. пл. **1 150,2 кв. м**, готовность **57 %,**
2-этажное здание с подвалом и мансардой.
Адрес: Могилевская обл., Осиповичский р-н, Вязьевский с/с, 20, вблизи д. Смык.
**Земельный участок** оздоровительного назначения общ. пл. **1,0000 га** предоставлен на праве постоянного пользования, находится в живописном месте в лесу на берегу озера. Начальная цена: **458 880,00 бел. руб.** (с НДС 20 %). Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X. УНП 191 021 390. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах:** электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1,5 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 09.07.2022

Дата и время начала и окончания торгов: **03.08.2022** с 11.00 до 13.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема документов: заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **01.08.2022** до 17.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

---

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н.М. извещает о проведении 8 августа 2022 года открытого аукциона со снижением начальной цены на 30 % по продаже ДЕБИТОРСКОЙ ЗАДОЛЖЕННОСТИ в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **1** | ООО «Гомельская Инжиниринговая Компания» – управляющая компания холдинга «Стройинжиниринг Групп», УНП 491325521 | **214,62** | 10,73 | 21,46 |
| **2** | ЧСУП «Рубеж Систем», УНП 491060084 | **5 519,30** | 275,96 | 551,93 |
| **3** | Лукское ОАО, УНП 490086076 | **46 778,73** | 2 338,94 | 4 677,87 |
| **4** | КСУП «Новый путь-агро», УНП 400001758 | **19 945,97** | 997,30 | 1 994,60 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович.

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 23 июля 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 4 августа 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

# СЁННЯ Ў МІНСКУ БОЛЬШ ЗА 17 ТЫСЯЧ ЗДЫМНЫХ КВАТЭР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У параўнанні з першым месяцам лета колькасць запытаў па пошуку здымнага жылля павялічылася амаль на трэць, і гэтая тэндэнцыя мае ўсе шанцы на працяг.

## Толькі лічбы: прапанова расце і зніжаюцца цэны

Згодна з інфармацыяй аддзела аналітыкі партала Realt, у параўнанні з маем попыт на арэнду кватэр у чэрвені і ліпені ў Мінску вырас на трэць, але прапанова ўсё роўна працягвае расці і ўстанавіла новы рэкорд. Цяпер на рынку доўгатэрміновай арэнды жылля ў сталіцы аб'ём прапановы кватэр дасягае 17 тысяч аб'ектаў. Больш за 8 тысяч такіх здымных кватэр трапіла ў доўгатэрміновую арэнду менавіта сёлета, калі стала вядома, што кватэрамі на суткі ў летнім сезоне будзе карыстацца мінімальная колькасць кліентаў.

Эксперты рынку нерухомасці адзначаюць: нягледзячы на тое што пачатак лета ў сталіцы звычайна характарызуецца высокім попытам на кватэры ў арэнду, сёлета пошукавая актыўнасць патэнцыяльных арандатараў была пасрэднай. За апошні месяц колькасць пошукавых запытаў «зняць кватэру ў Мінску» павялічылася, аднак у параўнанні з мінулымі гадамі іх колькасць для чэрвеня і ліпеня ў сярэднім ніжэй на 5—10 %.

Тым не менш, нягледзячы на нізкі попыт, колькасць арэндных кватэр у базе працягвае расці. У параўнанні з маем іх стала больш яшчэ на 3,5 %. У большасці сваёй прапанова вырасла за кошт адна- і двухпакаёвых кватэр (плюс 4 % за месяц у абодвух выпадках), ледзь меншы рост, на 3 %, адзначаўся ў трохпакаёвых кватэр. А бягучы ўзровень прапановы на 70 % вышэйшы, чым у пачатку лета 2021 года.

Сярэднія значэнні арэндных ставак у большасці сваёй працягвалі зніжацца. Найбольш адчувальна «аселі» аднапакаёвыя кватэры (мінус 1,2 %), якія цяпер арандуюцца ў сярэднім за 256 долараў. Двухпакаёвыя кватэры знізілі цэны не так значна (мінус 0,6 %) — 318 долараў, а трохпакаёвыя наогул засталі на месцы — 402 долары.

Варта адзначыць, што цяперашнія цэны арэнды кватэр у межах сталіцы ў сярэднім на 4-5 % ніжэйшыя, чым год таму.

У свой час людзі, у якіх былі грошы, укладвалі свае фінансы ў набыццё жылой нерухомасці, што прыносіла значны і стабільны даход у выглядзе арэндных ставак. На працягу чатырох апошніх гадоў гэтая даходнасць была значна вышэй ад развічанай даходнасці па валютных дэпазітах. На фоне зніжэння цэн на кватэры інвестыцыйная прывабнасць арэнды працягвае зніжацца. У той жа час максімальная даходнасць валютных дэпазітаў у лютым—маі паказала значны скачок, а цяпер — невялікае зніжэнне. Аднак і цяпер даходнасць па валютных дэпазітах (7,5 %) амаль на тры пункты вышэй ад інвестыцыйнай прывабнасці здачы ў арэнду кватэр (5,8 %).

## У пошуку бюджэтных кватэр

Спецыяльны сталічны сайт нерухомасці hata.by падлічыў, што пры самастойным пошуку здымнай



кватэры сярэдняя цана арэнды аднапакаёвай кватэры складае 210 долараў, двухпакаёвай — 262 долары, трохпакаёвай — 298 долараў.

Калі звузіць рамкі пошуку выключна недарагімі кватэрамі, то рэальная карціна для небагатых студэнтаў і маладых спецыялістаў будзе выглядаць вось так. У бюджэтным варыянце аднапакаёвая кватэра будзе каштаваць у арэнду 160—200 долараў, двухпакаёвыя апартаменты — 200—250 долараў, а трохпакаёвыя — да 280 долараў. Тут варта заўважыць, што такое жыллё будзе далёка ад цэнтра горада. Да таго ж самыя танныя кватэры размешчаны на крайніх паверхах шматпавярховых дамоў, а мэбля — у неідэальным стане.

Сёлета яркага дэфіцыту патрэбнага кватарантам жылля пакуль не назіраецца, а актыўна «вымываюцца» толькі самыя бюджэтныя аб'екты. Колькасць свабодных кватэр за месяц нават трохі павялічылася. Але бюджэтных кватэр становіцца ўсё менш.

## З «наваротамі»

Хай дэфіцыт не зашкальвае, але кватэру студэнтам пашукаць прыйдзецца. Мы падрыхтавалі для іх некалькі парад.

Першае — спытаць у будучых аднагрупнікаў, ці не шукае хтосьці сабе суседа. Інфармацыйных варыянтаў дапамогі маса: тэматычныя рэсурсы і форумы, паблік у сацыяльных сетках, тэлеграм-каналы, дзе збіраюць свежыя прапановы з розных сайтаў і яшчэ шмат чаго.

Дарэчы, у некаторых універсітэтах вешаюць дошкі аб'яў, дзе жыхары навакольных дамоў размяшчаюць прапановы. Варта прыглядзецца: можа быць, і ў вас такая ёсць. Падчас ажыятажу з агенцтвамі звязвацца цяжка. Яны ж прапануюць адну кватэру на некалькі дзясяткаў чалавек, таму атрымліваецца гульня навыперадкі «хто першы дабег — той і зняў». А яшчэ інфармацыя аб кватэрах часта не адпавядае рэчаіснасці. Кліентаў звычайна забаўляюць заніжанай арэнднай цаной, а ў рэальнасці яна вышэйшая.

Упэўнена заяўляю: здымаць жыллё ў аддаленых раёнах сталіцы нават добра. Маладым іншагароднім так спачатку прасцей вывучыць горад. Да таго ж пакоі і кватэры не ў цэнтры могуць каштаваць адчувальна танней. Акрамя таго, цэны на кватэры змяняюцца ў залежнасці ад сезона. Напрыклад, у канцы ліпеня і ў жніўні попыт на жыллё расце. Пік спадае дзесьці да канца лістапада. Да наступнага лета ўсё застывае на адным узроўні. Таму або пажыві пару месяцаў у кагосьці і шукай варыянт потым, або задумвайся над пошукам кватэры загадзя.

Не варта баяцца доўгай дарогі на вучобу і дадому. На самай справе ў студэнцтва шмат вольнага часу, плюс у дарозе можна нешта вучыць.

## Студэнт жа таксама чалавек

Большасць уладальнікаў кватэр першапачаткова з асцярогай ставіцца да студэнтаў і наогул да адзінокіх. Усе хочуць бачыць сваімі арандатарамі маладую сямейную пару.

Як жа знайсці паразуменне з гаспадаром такога патрэбнага жылля? Тут галоўнае не вонкавы выгляд, а ўменне пераконваць. Калі ты малады і адзінокі, без вечарынак не абысціся: на вуліцы збірацца холадна, а ў кафэ — дорага. Варта сумленна папярэдзіць гаспадароў, што госці будуць. Але ты гарантуеш чысціню і парадак. Увогуле, прыйдзецца пагаварыць па-даросламу. І паводзіць сябе гэтак жа. Не варта заводзіць коцікаў і сабачак употай ад гаспадароў. Усё роўна заўважаць.

Такім чынам, ты знайшоў жыллё, якое выглядае прыстойна на фотаздымках і падыходзіць па цане. Далей трэба стэлефанавацца з гаспадарамі, каб паглядзець кватэру. Калі пры знаёмстве арэндадаўца здаецца вам хоць бы трохі дзіўным — бяжыце. У будучыні гэтыя дзівацтвы могуць праявіцца ў дзвесце разоў мацней.

Бывае, класная кватэра заслане вочы, і зусім не ўнікаеш, які гаспадар чалавек, а гэта вельмі важна. Трэба адразу дамаўляцца аб распісцы і пераводзе грошай — лепш на картку, абмяркаваць умовы магчымых рамонтаў-паляпшэнняў і гэтак далей. А то вось мой знаёмы зняў утульную кватэру, зрабіў там касметычны, але дарагі рамонт, а яго адразу папрасілі вызваліць памяшканне — у выніку ён прагарэў на досыць вялікую суму.

І яшчэ, калі пры праглядзе падлашчваюцца і проста гатовыя «зніжачку зрабіць» — нешта нячыста. Чалавек, які здае кватэру, ведае, колькі каштуе яго жыллё, і не стане без прычыны апускаць цану. Гэта дакладна.

## Лепш заключыць дагавор, нават калі падатак будзеш плаціць ты

Аформіць «сяброўства» з гаспадаром лепш на паперы. Гэта гарантыя і для цябе (што жыллё будзе пэўны перыяд і плаціць трэба фіксаваную суму), і для арэндадаўцы (што ты не з'едзеш, будзеш прыносіць грошы, а да яго не завітае падатковая). Так спакайней усім. Але...

Афіцыйная рэгістрацыя паміж кватарантам і ўласнікам мае на ўвазе, што гаспадар кватэры павінен плаціць падатак за свой прыбытак. Падатак залежыць ад колькасці пакояў у кватэры. Як правіла, гаспадары дамаўляюцца пра «кампенсацыю» гэтага падатку. Звычайна падатак дзеляць з разліку 50 на 50, але доўг выплаты падатку застаецца за ўласнікам.

У дамове трэба абавязкова зафіксаваць усе важныя моманты. Яны датычацца ўмоў вяртання закладу (калі ён ёсць), стану кватэры (мэблі, тэхнікі, рамонту) да твайго выезду. Варта дамовіцца загадзя і пра тое, хто аплачвае камуналку. Калі гэта робіць гаспадар, прасі паказаць «плацёжкі»: былі выпадкі, калі яны штучна завышаліся. Ты аддаеш 100 рублёў, а рэальна гаспадар плаціць толькі 80.

## Правяраць лепш за ўсё пры засяленні

У аб'яве пішуць, якая кватэра добрая, але на практыцы — ідэальных практычна не бывае. Лепш загадзя падрыхтаваць спіс рэчаў, якія абавязкова трэба праверыць. Першае — гэта вокны. Ці дзьме там з усіх шчылін, ці адкрываюцца рамы. Лепш, каб стаялі шклопакеты.

Другі па значнасці пункт — сантэхніка, асабліва бачок у прыбіральні. Не саромейцеся націскаць на ўсё і круціць краны, бо ўсім гэтым трэба будзе карыстацца. Потым ідзе бытавая тэхніка. Яе трэба старанна праверыць, у якім яна стане: калі нешта зламанае, удакладніць, ці ў курсе гаспадар, што так ужо было. Гэта важна зафіксаваць, каб потым не расплачвацца за чужую шкоду. І яшчэ, асобна трэба праверыць уваходныя дзверы. Пераканацца, ці не захрасаюць ключы, ці ўсе замкі надзейныя і працуюць. Калі ў цябе ёсць нейкія асаблівыя патрабаванні (напрыклад, алергія на спецыфічныя пахі), лепш адразу спытаць, ці былі да гэтага часу ў кватэры кошкі або іншая жыўнасць.

## Касметычны рамонт вітаецца

Не трэба думаць, што савецкая шафа ў пакоі прыкручана да падлогі. Яе можна і трэба перасоўваць. Калі хочаш прывезці сваю мэблю ці, наадварот, пазбавіцца ад часткі гаспадарскай — не саромейся пра гэта спытаць. Як правіла, уласнік будзе толькі «за», таму што хтосьці прывядзе іх жыллё ў парадак.

Зусім не абавязкова перафарбоўваць падлогу і сцены: тыя ж плямы на шпалерах можна замаскіраваць дэкаратыўнымі налепкамі або плакатамі. А працёрты ламінат або лінолеум выдатна маскіруецца недарагім дываном.

І апошняе. Студэнты, асабліва першакурснікі, павінны быць гатовыя з'ехаць у любы момант. Аднойчы сын маіх знаёмых адзначаў здадзеную сесію, ды так, што суседзі паскардзіліся гаспадарам. Апошнія прыехалі на наступны ж дзень і папрасілі яго хуценька з'ехаць, нягледзячы на заключаны дагавор. Потым яны дамовіліся на падаўжэнне тэрміну высялення на тыдзень, але кватэра была страчана. А калі б студэнты былі знаёмыя з суседзямі і папярэдзілі іх аб запланаванай гулянцы, то экстраннага высялення можна было б пазбегнуць.

Арэнда пакоя ратуе, калі не ўдалося знайсці суседзяў для кватэры. Але гэта яшчэ больш ненадзейны варыянт. Гаспадары не трымаюцца за цябе гэтак жа, як пры зняцці жылля цалкам, таму могуць папрасіць з'ехаць у самы нечаканы момант.

## У Віцебску — прыватнае, у Гродне — ёсць і дзяржаўнае, а ў Брэсце яно дарагое

За колькі можна зняць кватэру ў Віцебску? У горадзе рэальна нядорага арандаваць нерухомасць на працяглы тэрмін, але для гэтага прыйдзецца праглядзець мноства варыянтаў. Да таго ж прапановы без пасрэднікаў абыходзяцца танней. Для эканоміі можна скарыстацца прапановай па падсяленні. Такія варыянты стартуюць са 130 рублёў у месяц.

Каб зняць менавіта кватэру, прыйдзецца выдаткаваць больш. Цэны на аднапакаёвыя кватэры стартуюць з 80—100 долараў у месяц. Па такой цане будзе жыллё не вельмі добрай якасці. Як правіла, без мэблі і першы паверх. Сярэдні цэннік аднапакаёвай кватэры ў гэтым абласным цэнтры знаходзіцца ў дыяпазоне 130—150 долараў.

А ў Гродне вызваліліся 13 дзяржаўных кватэр, якія можна ўзяць у арэнду. Усяго ў спісе чатыры — аднапакаёвыя, дзве — трохпакаёвыя, астатнія — двухпакаёвыя. Шэсць жылых памяшканняў прызначаныя для першачаргавікоў, уключаючы адну — для суддзяў і пракурорскіх работнікаў. Амаль усе кватэры добраўпарадкаваны, у дзвюх з іх — частковыя выгоды. Напрыклад, на Савецкай, 15 няма ваннай, газавай калонкі, а на Пралетарскай, 8 адсутнічаюць цэнтральнае ацяпленне, каналізацыя, гарачая вада, газ — у балонах. У гэтых кватэрах месяц арэнды жылля абыдзецца ад 72,95 да 246,53 рубля ў залежнасці ад плошчы кватэры і наяўнасці камунікацый.

Першачаргавікі заплацяць менш: для іх да арэнднай платы ўжываецца паніжальны каэфіцыент — 0,1 з улікам складу сям'і. Заявы на прадастаўленне арэнднага жылля прымаюць службы «Адно акно» адміністрацый Ленінскага і Кастрычніцкага раёнаў да 21 ліпеня ўключна. Ад першачаргавікоў — служба «Адно акно» Гродзенскага гарвыканкама.

У Брэсце ёсць прапановы па здачы асобнага жылля або на падсяленне. Апошні варыянт бюджэтны, часцей за ўсё яго выбіраюць студэнты і працоўная моладзь. Зняць пакой у Брэсце каштуе ад 140 рублёў у месяц. Арандаваць аднапакаёвую кватэру («маласямейкі») або пакой у прыватным сектары з асобным уваходам, але без выгод, атрымаецца прыкладна за 280 рублёў. Паўнавартасная аднапакаёвая жылплошча з «бабулінай» мэбляй абыдзецца даражэй — ад 110 долараў. Сярэдні цэннік невялікай, але дагледжанай кватэры складае ад 130 да 150 «зялёных». Двухпакаёвыя кватэры прапануюцца за 150—180 долараў. А самая высокая арэндная стаўка ў Брэсце на трохпакаёвую нерухомасць — 180—210 долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НА ЭКРАНЕ — ... ВАН ГОГ

## Як кінапракат выжывае пасля пандэміі і санкцый

**Трапіць на прагляд доўгачаканага фільма з любімымі акцёрамі — значыць перажыць непаўторныя эмоцыі. Кінатэатр ва ўсе часы застаецца адным з самых прывабных месцаў адпачынку як для асобных наведвальнікаў, так і для ўсёй сям'і. Аднак, як мы ўжо маглі адчуць, бывае, што абставіны ўплываюць на колькасць людзей, якая ідзе ў кінатэатры, і на тое, што там ім гатовыя прапанаваць. Калі ў свеце разгарэлася пандэмія, пачаліся няпростыя часы для кінапракату (і беларускага). А апошнія месяцы на жыццядзейнасць дадзенай сферы аказвае ўплыў і палітычная абстаноўка ў свеце. Інфармацыя пра тое, як сыходзяць з беларуска-расійскага рынку дыстрыб'ютары каканых сусветных прэм'ер, безумоўна, засмучае. Аднак мы паспрабавалі даведацца ў спецыялістаў сферы кінапракату, хто прыйдзе на вызваленыя месцы і ці сапраўды крызіс — час для росту.**

Калі зазірнуць на сайты хоць бы абласных арганізацый пракату, то там значацца такія прапановы, як «Мы — монстры-2», «Дапамажыце, я зменшыў сваіх сяброў», «Уцёкі з космасу» і іншыя. У асноўным афіша разлічана на сямейную ці дзіцячую аўдыторыю, што актуальна летам, бо цяпер час канікулаў і адпачынкаў. Ёсць тут і камедыя «Булкі», хорар «Молах» і паказ трылера «Скіўцы. Сутыкненне». Недзе нават маем магчымасць паглядзець фільм «Галоўная роля» з Пенелопай Крус і Антоніа Бандэрасам, які з'явіўся ў пракаце з канца чэрвеня. І раз ёсць прапанова, то, верагодна, існуе і попыт сярод аўдыторыі. Напрыклад, у сталіцы з пачатку года кінатэатры сеткі УП «Кінавідэапракат» наведала каля 450 тысяч гледачоў. У пяцёрку лідараў пракату за першае паўгоддзе трапілі такія карціны, як «Чалавек-павук: няма дарогі дадому», «Анчартэд: на картах не значыцца», «Апошні асілак: пасланец цемры», «Дом Гучы» і «Зверапой-2».

— У перыяд школьных канікулаў і водпускаў мы назіраем павышаную цікавасць да сямейнага кантэнту. Нашы гледачы любяць кіно ва ўсёй яго разнастайнасці, але традыцыйна найбольш папулярныя ў такой катэгорыі — фэнтэзі, камедыі, акрамя таго, заўсёды свайго гледача знаходзяць трылеры і фільмы жахаў, — дзеліцца **першы намеснік генеральнага дырэктара УП «Кінавідэапракат» Мінгарвыканкама Вольга ДЗЮЛЬДЗЯ.** — На жаль, нашы гледачы пакуль не ўбачылі такіх сусветныя прэм'еры, як «Бэтмен», «Я чырванею», «Морбіус», «Доктар Стрэндж: у мультысусвеце вар'яцтва», «Баз Лайтэр», «Дрэнныя хлопцы» ды іншыя. Але мы не губляем надзеі, што ўсё ж зможам яшчэ ўбачыць гэтыя фільмы на вялікім экране. Вядома, мы страцілі пэўную ўвагу гледачоў з-за адсутнасці сусветных прэм'ер за апошнія некалькі месяцаў, але пры гэтым мы імкнёмся зрабіць рэпертуар разнастайным за кошт кінанавінак незалежных кінастудый, перавыпускаў культавых фільмаў, розных праектаў і праграм.

Адзін з такіх праектаў TheatreHD — трансляцыі на экранах кінатэатраў самых вядомых спектакляў з найлепшых тэатраў свету, сярод якіх і Каралеўскі нацыянальны тэатр (Лондан), Шэкспіраўскі тэатр «Глобус» (Лондан), Метраполітан-опера (Нью-Ёрк), Вялікі тэатр (Масква) і г. д., а таксама навінка бягучага сезона — паказ спектакляў-намінантаў на вядучую расійскую тэатральную прэмію «Залатая маска». TheatreHD уключае ў сябе яшчэ і ўнікальныя фільмы-выстаўкі, якія даюць магчымасць гледачам перанесціся ў вядомыя музеі свету і ў дэталях разглядаць палотны Ван Гога, Манэ, Рэмбранта і шэрага іншых знакавых мастакоў. Варта адзначыць, што місія праекта якраз і заключаецца ў тым, што кожны можа далучыцца да знаёмства з шэдэўрамі сусветнага тэатра і выяўленчага мастацтва праз вялікі экран, не пакідаючы родны горад. Паказы такога кшталту ладзяцца ў Грузіі, Расіі, Азербайджане, Казахстане і іншых краінах, а ў Мінску з гэтым праектам працуе кінатэатр «Цэнтральны».

Увогуле, калі разглядаць сітуацыю з магчымасцю глядзець кіно на вялікім экране на прыкладзе сталіцы, то кінатэатры тут разгрупоўваюцца як у цэнтры горада, так і ў спальных раёнах. І як адзначае Вольга Дзюльдзя, у арганізацыі ёсць жаданне пашырацца, каб на базе ўжо існуючых адназальнікаў з'яўляліся новыя залы, паколькі гэта дазволіць разнастаіць і рэпертуар, і ўвогуле палітру паслуг для наведвальнікаў кінатэатраў. Так, напрыклад, у пачатку лета адкрыўся пасля абнаўлення кінатэатр «Мір». Тут правялі рамонт у глядацкай зале (з'явіўся нават VIP-рад), у санвузлах, змянілася прыкасавая зона, лесвіца. І абноўлены кінатэатр зноў рады запрашаць сваіх наведвальнікаў на кінасеансы.

— Перыядычна той ці іншы кінатэатр зачыняецца на рэканструкцыю, падчас якой абнаўляюцца інжынерныя сеткі і камунікацыі, мяняецца абсталяванне, рамантуюцца залы, фае, прыбіральні. Амаль усе будынкі нашых кінатэатраў — доўгажыхары, таму падтрымліваць і паляпшаць іх проста неабходна, — кажа спецыяліст. — Таксама амаль ва ўсіх кінатэатрах нашай сеткі створана безбар'ернае асяроддзе. У філіяле кінатэатра «Беларусь» усталяваны спецыяльныя сістэмы — DOLBY FIDELIO и DOLBY CAPTIVIEW для людзей, якія маюць праблемы са зрокам ці са слыхам.

Як бачым, нягледзячы ні на што, сфера кінапракату працягвае функцыянаваць, шукае і стварае цікавыя прапановы для кінаманаў, а таксама клапоціцца пра тое, каб паляпшалася якасць паслуг, якія прапаноўваюць кожнаму з нас у кінатэатрах. На Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» сітуацыю сыходу з айчыннага кінарынку замежных дыстрыб'ютараў таксама ацэньваюць у нейкай ступені пазітыўна. Бо ў калекцыі беларускага кіно ёсць шмат кінастужак розных жанраў, якія варта паглядзець, але не заўсёды ім удавалася быць заўважанымі і ацэненымі на фоне замежных навінак, а цяпер — самы час...

— Бягучы год, як вядома, асаблівы для нас, бо праходзіць як Год гістарычнай памяці, таму яшчэ з зімы ў нас створана цэлая праграма кінапаказаў, якая цяпер рэалізуецца па краіне. Пачалася яна з мая і працягнецца да восені. Туды ўваходзяць паказы фільмаў айчыннай вытворчасці за розныя гады, у прыватнасці, патрыятычнай накіраванасці, — распавядае **вядучы спецыяліст прадзюсарскага цэнтра Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый ІГРУША.** — З намі актыўна супрацоўнічаюць усе кінапракатныя арганізацыі ў краіне, таму фільмы нашы можна ўбачыць на вялікім экране як у абласных цэнтрах, так і ў раённых гарадах. Акрамя таго, мы ладзім сустрэчы вядучых кінематаграфістаў з гледачамі перад кінасеансамі, што таксама павышае цікавасць да кінастужак.

У ліку фільмаў, якія цяпер прапаноўваюцца для пракату, «Анастасія Слуцкая», «Чалавек, які браў інтэрв'ю», «Альпійская балада», «Я родам з дзяцінства», «Пайсці і не вярнуцца», «Дрэвы на асфальце» і іншыя. У дадзены момант на кінастудыі таксама актыўна вядзецца аднаўленне фільмаў (іх рэстаўрацыя), і таму многія стужкі выходзяць на вялікі экран упершыню ў абноўленым выглядзе. Увогуле, на сёння ў калекцыі «Беларусьфільма» каля 600—700 карцін. Вядзецца ўжо ў тым ліку і актыўная падрыхтоўка да святкавання 100-годдзя беларускага кіно (гэтую дату мы адзначым у 2024 годзе).

— І з такой нагоды мы сумесна з Акадэміяй навук працуем над адборам «100 найлепшых фільмаў Беларусі». Задача не з простых, але мы задзейнічалі спецыялістаў, кінакрытыкаў, кіназнаўцаў, каб вызначыць самыя лепшыя гульнявыя, анімацыйныя, дакументальныя кінастужкі, — дзеліцца Юрый Віктаравіч. — І цяпер мы актыўна садзейнічаем таму, каб беларускае кіно паказвалі шырокай аўдыторыі. Паколькі складваецца сітуацыя, калі сышлі асноўныя амерыканскія дыстрыб'ютары з нашага і расійскага кінарынкаў, гэта дае нам добрую магчымасць нагадаць і заявіць пановаму пра сябе, паказваць сваё айчыннае кіно.



Актыўная работа праводзіцца кінастудыяй і з тэлебачаннем, дзе перыядычна можна злавіць і прэм'еры, і добрае кіно са знакам якасці. У тэлеэфіры можна было паглядзець 4-серыйны фільм «У пагоні за анёлам» (яго паказы на некаторых каналах яшчэ толькі плануюцца), серыял «Полымя пад попелам» Івана Паўлава, на аснове якога зрабілі фільм «Падрыў», што з пачатку ліпеня знаходзіцца ў пракаце па ўсёй краіне. І супрацоўніцтва ў гэтым напрамку працягваецца.

А што датычыцца кінапракатных арганізацый, то ў дадзеным кірунку прадугледжана і запланавана правядзенне розных акцый. З шэрага такіх 22 чэрвеня быў паказ фільма «Ідзі і глядзі», які праходзіў па ўсіх абласцях, прычым таксама з удзелам стваральнікаў вядомай кінастужкі. У Сусветны дзень абароны дзяцей «Беларусьфільм» зладзіў паказ калекцыі мультфільмаў для сваіх юных гледачоў. Увогуле, тут з кінапракатнымі арганізацыямі працуюць па алгарытме заключэння дагавора на год, што дазваляе пракатчыку самому выбіраць, якія фільмы з'явяцца ў яго афішы. Адносна таго, што плануе паказаць і прапанаваць кінааматарам кінастудыя — восенню на Дні горада Мінска будуць паказы фільмаў. Чакаецца нават прэм'ера маладых рэжысёраў «Мінск — гэта я», фільм ужо распачаў сваю фестывальную вандроўку. А на Дні беларускага пісьменства прэзентуюць аўдыторыі мультыплікацыйны фільм «Класікі і шахматы», прысвечаны пісьменнікам Янку Купалу і Якубу Коласу з нагоды іх 140-годдзя.

Варта чакаць пэўнага ажыўлення на айчынным кінарынку і ў сувязі з «Лістападам». Сёлета ў планах арганізатараў фестывалю пашырыць паказы фестывальных кінастужак у рэгіёнах. І таксама ёсць імкненне адразу на кінафоруме прыкмячаць фільмы на дыстрыб'юцыю і пасля заканчэння мерапрыемства, каб найлепшае кіно «Лістапада» змаглі ўбачыць у розных кутках Беларусі.

Калі разглядаць сітуацыю з кінарынкам, то ўсё быццам бы і нядрэнна. Аднак пакуль яшчэ так і невядома, калі беларусы ўбачаць некаторыя чаканыя кінапрэм'еры, а таксама ці дажывём мы да часоў, калі нашых акцёраў у тых жа рэгіёнах не будуць лічыць расійскімі, бо пазнаюць іх часцей, на жаль, усё ж па камедыях і серыялах краіны-суседкі. Можа, варта нашым кінавытворцам перагледзець свае планы адносна свайго прадукту, ці ўсё ж у нас праблемы з добрымі сцэнарыстамі і рэжысёрамі, і рызыкаваць, як і эксперыментаваць, ніхто не хоча?

**Алена ДРАПКО.**




Кніжныя навінкі

# ЗРАЗУМЕЦЬ САПРАЎДНАЕ

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы продавца на проведение независимой оценки и независимой экспертизы внутренней оценки, оплатить услуги оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. *Расходы Продавца на проведение независимой оценки и на проведение независимой экспертизы внутренней оценки по лоту № 1 составляют 1322,68 бел. руб. с НДС*. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Позняк Светлана Георгиевна, +375 (33) 317 50 00.

# РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

## извещает о проведении 25.08.2022 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-52778 общей площадью 440,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, д. 18. Назначение: здание специализированное для общественного питания; наименование: столовая. Составные части и принадлежности: литер Х 1/к – пристройка. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000001002170 площадью 19,0241 га (право постоянного пользования). *В отношении части капитального строения имеется действующий договор аренды*. **Начальная цена продажи – 311 040,00 бел. руб., задаток – 31 104,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-15550 общей площадью 470,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, д. 18. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: К 1/к. Здание склада огнеопасных материалов. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000001002170 площадью 19,0241 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 230 688,00 бел. руб., задаток – 23 068,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инвентарным номером 614/D-17867 общей площадью 40,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, аг. Слобода, ул. Машерова, д. 3, кв. 71. Назначение: квартира; наименование: квартира (*имеется самовольная перепланировка, незарегистрированная в установленном порядке; имеются зарегистрированные граждане*). **Начальная цена продажи – 45 000,00 бел. руб., задаток – 4 500,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Земельный участок с кадастровым номером 321081600009000030 площадью 0,0922 га (право собственности), расположенный по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Грабовский с/с, сад. тов-во «Ягодка», 45. Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 1 668,82 бел. руб., задаток – 166,88 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Земельный участок с кадастровым номером 624487600006000010 площадью 0,0397 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Блужский с/с, СТ «Спадчина-88». Целевое назначение: садоводство в садоводческом товариществе «Спадчина-88». **Начальная цена продажи – 468,46 руб., задаток – 46,85 руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Земельный участок с кадастровым номером 424385700001000060 площадью 0,1134 га (право собственности), расположенный по адресу: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Волковичский с/с, СТ «Берёзка», д. 11. Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 1 270,08 бел. руб., задаток – 127,01 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 643/С-15914 общей площадью 3 407,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Любанский р-н, г. Любань, ул. Боровика, 58. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); наименование: ремонтная мастерская. Составные части и принадлежности: А1/кп – ремонтная мастерская. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623450100001003249 площадью 1,5906 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 502 848,00 бел. руб., задаток – 50 284,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 322/С-19721 общей площадью 1 187,9 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Рогачёвский р-н, г. Рогачёв, ул. Александра Пушкина, 67Б. Назначение: здание нежилое; наименование: пункт ТО животноводческих ферм. Составные части и принадлежности: двухэтажное кирпично-панельное здание «Пункт ТО животноводческих ферм». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 324750100002001363 площадью 0,3031 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 164 160,00 бел. руб., задаток – 16 416,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Изолированное помещение с инвентарным номером 610/D-42525 общей площадью 39,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 39, рынок строительных материалов, торговый ряд № 16, торговый павильон № 212. Назначение: торговое помещение; наименование: торговый павильон. **Начальная цена продажи – 15 120,00 бел. руб., задаток – 1 512,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10**. Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-37898 общей площадью 20,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 50 лет БССР, (массив гаражей) гараж б/н. Назначение: здание нежилое; наименование: гараж. Составные части и принадлежности: кирпичный гараж с подвалом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 640400000009000236 площадью 1,9115 га. **Начальная цена продажи – 4 347,00 бел. руб., задаток – 434,70 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11**. Объект недвижимого имущества в составе:

капитальное строение с инвентарным номером 640/С-83761 общей площадью 810,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Гагарина, 48Г. Назначение: здание специализированное для общественного питания; наименование: здание солдатской столовой, инв. № 1003007. Составные части и принадлежности: здание солдатской столовой А1-2/к с пристройкой Б1/м, пристройкой 1. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001008881 площадью 0,4086 га (право аренды).

Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-93885 общей площадью 1010,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Гагарина, 48Г. Назначение: сооружение неустановленного назначения; наименование: элементы благоустройства, относящиеся к зданию солдатской столовой, инв. №14/127. Составные части и принадлежности: покрытие асфальтобетонное 1.1, бордюр 1.2, ограждение 1.3, покрытие плитка 1.4. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001008881 площадью 0,4086 га (право аренды). *Имеется запрещение отчуждения недвижимого имущества до выполнения условий договора купли-продажи.* **Начальная цена продажи – 197 510,40 бел. руб., задаток – 19 751,04 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-25466 общей площадью 1 601,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 228/7. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; наименование: арочный гараж. Составные части и принадлежности: А1/м – арочный гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001005688 площадью 9,0631 га (право аренды). *Является объектом ипотеки. В отношении капитального строения имеется действующий договор аренды.* **Начальная цена продажи – 237 600,00 бел. руб., задаток – 23 760,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-39635 общей площадью 123,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 4А/1. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); наименование: пристройка АБК цеха малой механизации. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623850100003002652 площадью 0,8646 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 41 580,00 бел. руб., задаток – 4 158,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-11954 общей площадью 131,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 6/2. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: здание контрольно-пропускного пункта. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000003000041 площадью 1,5907 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 149 040,00 бел. руб., задаток – 14 904,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-31451 общей площадью 665,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Молотковичский с/с, 11/1, здание склада, юго-восточнее д. Домашицы. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: здание склада и производственно-вспомогательного цеха. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 125486800002000018 площадью 11,9532 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 125 388,00 бел. руб., задаток – 12 538,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 16.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-166725 общей площадью 196,5 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240А/2. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: административный корпус. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000006000401 площадью 0,992 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 82 080,00 бел. руб., задаток – 8 208,00 бел. руб.. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 25.08.2022 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27 в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 22.08.2022 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **25 августа** 2022 года.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона:**
**+375 44 763 62 63; + 375 17 266 63 02.**

Слова пісьменніка

**Аляксандр РАДЗЬКОЎ**

# РЭКТАРЫ: урыўкі з новай кнігі

## Тэорыя і практыка маёй рэктарскай работы




А яшчэ ва ўніверсітэце ёсць уплывовая праслойка загадчыкаў кафедраў. У рэктара і дэкана маецца які-ніякі, але ўсё ж такі адміністрацыйны рэсурс. У загадчыка кафедры яго амаль няма. А кіраваць трэба прафесійнымі вучонымі, выкладчыкамі. Камандным голасам тут не возьмеш, патрэбна перакананнем, інтэлектам. І загадваць кафедрай дакладна павінен перш за ўсё вучоны. Ён адказвае за якасць вучэбнага працэсу па профілі кафедральных дысцыплін, за прадукцыйнасць навуковых даследаванняў, за падрыхтоўку вучэбных дапаможнікаў, за напісанне падначаленымі дысертацый, за распрацоўку новых вучэбных курсаў. Дарэчы, пра вучэбныя курсы. Усе члены кафедры жадаюць чытаць імі ж распрацаваныя, гадамі апрабаваныя і таму звыклыя. А кожны год укараняюцца новыя вучэбныя прадметы, і тады аўтарытэтны загадчык у пачатку вучэбнага года прапануе калегам выбраць прывабную для іх вучэбную нагрузку, тое ж, што застаецца, што «дрэнна ляжыць», павінен браць на сябе. Здараецца, на кафедры выяўляюцца два відавочныя лідары, і тады непазбежна даводзіцца разводзіць іх — ці вылучаць новую кафедру, ці павышаць аднаго з іх.

У васьмідзясятыя гады мы захоплена чыталі раман І. Грэкавай «Кафедра». Пад гэтым псеўданімам хавалася вядомы матэматык, спецыяліст у галіне тэорыі імавернасцяў, прафесар Алена Сяргееўна Вентцэль. З якім разуменнем, з якім мастацкім і прафесійным густам яна апісала жыццё ўніверсітэцкай кафедры! Я пасля сваёй кафедры знайшоў усе ее вобразы, у тым ліку і свой! Упэўнены, што і цяпер універсітэцкія кафедры жывуць падобным жыццём.

Рэктар павінен адчуваць кожную кафедру, таму што ва ўніверсітэцкай структуры — гэта жыватворныя клеткі, яны забяспечваюць здаровую жыццядзейнасць усяму гэтаму няпростаму, але вельмі актыўнаму жывому арганізму. Патрэбна не толькі ведаць і рэгулярна сустракацца з загадчыкамі кафедраў, але бываць і на пасяджэннях кафедраў, а часам і на лекцыю да выкладчыкаў схадзіць, асабліва калі яна адкрытая. Так, дарэчы, можна дайсці практычна да кожнага выкладчыка.

У мяне была яшчэ практыка сустрэчы з маладымі выкладчыкамі, якія закончылі ўніверсітэт і засталіся для работы на кафедрах. Задачы простыя: вызначыцца з кірункам навуковай работы, планамі на аспірантуру. У калектыве не адмаўляцца ад любой работы, знайсці сябе ў шматпланавым і вельмі насычаным універсітэцкім жыцці. Дзяўчатам абавязкова казаў, што не трэба адкладваць шлюб і нараджэнне дзіцяці на час пасля аспірантуры ці пасля абароны дысертацыі. Асноўныя задачы жыцця павінны выконвацца. Тады і поспехі ў рабоце абавязкова будуць, і прыйдуць яны своечасова.

У час, калі я быў старшынёю студэнцкага прафкама, 1 верасня, пасля ўсіх урачыстых мерапрыемстваў з нагоды пачатку навучальнага года, мы з сакратаром камітэта камсамола Валодзем Матвейчуком вырашылі выпіць. Адзначыць гэту падзею. Проста ў кабінеце камітэта камсамола. Было ўжо пяць гадзін вечара, і мы нават не зачынілі дзверы на ключ. Наша памочніца Люда Дземянчук, заўважыўшы нашы захопленыя прыгатаванні, насцярожылася:

— Вы што прыдумалі? Збіраецеся проста тут і цяпер піць віно? Уяўляеце, вы са шклянкамі ў руках — і раптам заходзіць рэктар?!

Разыграўшы гэтую магчымую сцэнку, яна падыходзіць да дзвярэй, адчыняе іх, нават не адварочваецца, і мы з Матвейчуком ашалела бачым за яе спіной... рэктара Кудрашова! Шок! Яўген Паўлавіч зайшоў, пацікавіўся планамі, настроем, нешта нам дару-чыў і выйшаў. Вось з таго часу ў мяне ўстаноўка: рэктар павінен цікавіцца ўсім, у тым ліку і накалам студэнцкага жыцця.

Я практыкаваў сістэмную работу са студэнцкім актывам — з выдатнікамі вучобы, са старастамі вучэбных груп, з прафоргамі і камсоргамі, са старастамі пакояў у інтэрнаце. Афіцыйна адносіў іх да рэктарскай вертыкалі кіравання, адкрыта абапіраўся на іх. Казаў, што я і выкладчыкі бачым студэнтаў толькі з боку кафедры, старасты ж груп — каманда кіраўнікоў непасрэдна на перадавой фронту. А старасты пакояў у інтэрнаце прадстаўляюць кіраўніцтва ВНУ нават ноччу. Таму я раз у семестр дакладваў усяму гэтаму актыву планы развіцця ўніверсітэта, вынікі выкананай работы, адказваў на іх пытанні і прымаў прапановы. Жывы кантакт! Студэнтам гэта падабалася, яны да такіх сустрэч таксама рыхтаваліся, мы ўсе пры гэтым адчувалі сябе адной камандай. Такая работа прыносіла плён. Студэнты атрымлівалі вопыт і першасныя навыкі кіраўніцтва, а мы валодалі абстаноўкай у студэнцкім асяроддзі ў поўным аб'ёме. Мяркую, у гэтым плане будзе паказальным наступны прыклад.

Кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна горада Магілёва (пасля яго мэр) Уладзімір Міхайлавіч Цумараў балаціраваўся ў гарадскі Савет дэпутатаў. Наш універсітэт з інтэрнатамі размяшчаўся на яго тэрыторыі, таму ён прыйшоў да мяне за падтрымкай на выбарах. Мы сябравалі, таму я сказаў яму:

— Уладзімір Міхайлавіч, магу гарантаваць, што вас выберуць, нават у першым туры, але пры адной умове.

— Якой? — цікавіцца Цумараў.

— Нам патрэбны прыгожыя ліхтары на алею са скульптурамі перад галоўным вучэбным корпусам. Такім чынам мы ўпрыгожым не толькі ўніверсітэт, але і гэты раён горада.

— Згодзен!

— Тады пойдзем удвух на сустрэчу са старастамі пакояў нашых інтэрнатаў!

Мне падалося, што ад сустрэчы са студэнтамі Уладзімір Міхайлавіч атрымаў не меншае задавальненне, чым ад свайго абрання ў гарадскі Савет.

У рабоце рэктара шмат тонкіх момантаў, асаблівасцяў, здараюцца і непрыемнасці. Неяк у нядзелю, позна вечарам, вяртаемся з Таццянай з лецішча. Стомленыя, нагружаныя, у пыле. І бачым ў сябе каля кватэры на шостым паверсе дацэнта П. Яна ўся ў слязах і нават з пачарнелым тварам. Пытаюся:

— Што здарылася?

— Мяне затрымала міліцыя...

— За што?

— Прымала экзамен у студэнтаў-завочнікаў. Пасля іх сыходу знайшла пакет. Забрала яго з сабою, падумала, што забыўся нехта са студэнтаў. Паспрабавала іх дагнаць, але яны хутка сышлі. Вырашыла гэты пакет забраць з сабою, каб знайсці студэнтаў на наступны дзень. Выйшла з універсітэта, і мяне адразу затрымалі.

— Чаму не пакінулі пакет у вахцёра?

— Не падумала...

— Што было ў пакеце?

— Бутэлька віна, батон каўбасы, каробка цукерак.

— Што было ў міліцыі?

— Я расказала ўсё, як было. Мяне адпусцілі. Што мне будзе?

Вось і сітуацыя. А выкладчык добры! Як рэктару павесці сябе ў такім выпадку? Я вырашыў яе выручаць, хоць і разумеў, што пачую выгадную для яе трактоўку таго, што здарылася. Непрыемны выпадак, але не самы цяжкі. Вось яшчэ!

У мяне ва ўніверсітэце на эканамічным факультэце вучылася будучая жонка майго пляменніка. Мая мама з ёю кантактавала, цікавілася яе вучобай і аднойчы мне гаворыць:

— Саша, што ў цябе адбываецца ва ўніверсітэце? Іра мне расказвала, што іх выкладчык вышэйшай матэматыкі за здачу заліку бярэ са студэнта 30 долараў.

Клічу да сябе гэтага выкладчыка. Пытаюся, чаму ідуць такія размовы. Ён абураецца, пагражае абвінаваціць мяне ў паклёпе. Пытаюся:

— Чаму па вашым прадмеце толькі 20 працэнтаў паспяховасць?

Апраўдваецца:

— Вы, Аляксандр Міхайлавіч, матэматык, можаце прафесійна ацаніць складанасць задач, якія я даю студэнтам на заліку. Паглядзіце іх.

Гляджу. Задачы з курса матэматычных метадаў у эканоміцы. Для мяне, вядома ж, знаёмыя, а для многіх студэнтаў эканамічнага факультэта нязвыклыя. Метады работы некаторых нядобрасумленных выкладчыкаў вядомыя — такімі задачамі яны ўсіх студэнтаў «ставяць на калені», а хто хоча падняцца — павінны плаціць.

Працягваю цяжкую размову:

— Ваш загадчык кафедры дацэнт Марозаў чытае такі самы вучэбны курс. Ён вельмі строгі і патрабавальны выкладчык, але ў яго паспяховасць 80 працэнтаў. І ніхто, ніколі і нідзе не казаў, што ён патрабуе са студэнтаў грошы за паспяховую здачу заліку. Я не магу даказаць, што вы так паступаеце, але я вымушаны вас папярэдзіць і абвясціць пра няпоўную адпаведнасць займанай пасадзе.

На жаль, ён не пачуў маіх папярэджанняў, быў затрыманы аператыўнікамі ў горадзе пры атрыманні хабару, асуджаны і адбываў вызначаны тэрмін пакарання. Шкада, што я не змог яго ўтрымаць, — вельмі таленавіты матэматык і суперпрагматык. Дарэчы, следства адзначыла загад рэктара пра няпоўную адпаведнасць займанай пасадзе.

Хабарніцтва ва ўніверсітэце, асабліва на ўступных экзаменах, было галаўным болем усіх рэктараў. Вядомы скандальны выпадак, калі некалькі выкладчыкаў аднаго з гомельскіх універсітэтаў за хабар асудзілі на вялікія тэрміны. Здавалася б, усім навука! Але ж не! Літаральна праз год трапіліся на хабарніцтве выкладчыкі другога гомельскага ўніверсітэта, літаральна праз дарогу. Крымінальныя справы за хабар рэгулярна трэслі ўсе ВНУ краіны, пакуль мы пры прыёме ва ўніверсітэты не перайшлі на цэнтралізаванае тэсціраванне.

У рэктарскія справы я ўцягнуўся з першых дзён. Засвоіць маштаб і адпаведную палітыку мне вельмі дапамагла работа на выбарах Прэзідэнта даверанай асобай Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. Непасрэдныя кантакты з кіраўнікамі вобласці і раёнаў, выступленні ў рабочых калектывах многіх прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці, дзелавыя сустрэчы з членамі Ўрада і асабіста з Аляксандрам Рыгоравічам дазволілі ўсвядоміць і канкрэтызаваць планы развіцця ўніверсітэта, яго перспектыву, адчуць сябе рэктарам болей упэўнена. Часта даводзілася сустракацца і з міністрам адукацыі Васілём Іванавічам Стражавым, яго намеснікамі. Мяне ўводзілі ў планы і будні работы міністэрства, я стаў часта там бываць. У 2001 годзе Стражаў і яго каманда рыхтавалі Першы з'езд настаўнікаў з удзелам Прэзідэнта, і міністр папярэдзіў, што плануе на ім маё выступленне. Але пачалася выбарчая кампанія, і пасля выбараў Прэзідэнта міністрам быў прызначаны Пётр Іванавіч Брыгадзін. Працягвалася пры ім падрыхтоўка да з'езда ці не, я не ведаю. З Пятром Іванавічам да гэтага блізка знаёмы не быў, і ў тыя справы мяне не ўводзілі. Адразу пасля інаўгурацыі Прэзідэнта мы з Таццянай паехалі на адпачынак у Сочы, у санаторый «Беларусь». Разам з намі там адпачываў рэктар Віцебскага ўніверсітэта прафесар Аркадзь Уладзіміравіч Русецкі, дарэчы, былы сакратар ЦК КПБ па ідэалогіі. Тады міністр яшчэ не быў прызначаны, а я ведаў, што на гэтую пасаду разглядаецца і кандыдатура Русецкага. Мы разам гулялі па парку, і я выразна адчуваў яго напружанае чаканне. Я ўжо быў спакойны. Як рэктара мяне ўжо прызналі, свае пазіцыі я ўмацаваў, як развіваць універсітэт, ведаў, таму спачуваў перажыванням Аркадзя Уладзіміравіча і спадзяваўся, што ў выпадку яго прызначэння ён не забудзе нашы сочынскія даверлівыя размовы. Пасля мы даведваемся, што міністрам адукацыі прызначаны Брыгадзін. Можа быць, Русецкі і быў засмучаны, але выгляду ён не даў. Да такіх кадравых метамарфоз ён быў гатовы яшчэ з часін свайго партыйнага мінулага. Тым больш што вакантнымі заставаліся пасады намеснікаў міністра. Мяне гэта таксама мала хвалявала. Ніякіх размоў пра мой пераход на іншую работу я ні ад каго не чуў. І тут раптам мне на мабільны тэлефон звоніць віцэ-прэм'ер Уладзімір Несцеравіч Дражын. Ён гаворыць, што прынята рашэнне прызначыць мяне намеснікам міністра. Я шчыра засмуціўся: такога павароту ў сваім лёсе відавочна не чакаў, тым больш не планаваў і да яго не быў гатовы. Вярнуўшыся, далажыў пра гэтую прапанову губернатару Барысу Васілевічу Батуру, расказаў свайму старэйшаму сябру-настаўніку Якаву Іванавічу Трашчанку. Яны безагаворачна падтрымалі мяне ў думках адмовіцца ад прапанаванай пасады. Але працэс узгаднення на новую пасаду ўжо пайшоў. Гутаркі, медыцынскія камісіі — я амаль прымірыўся, што з універсітэта давядзецца сыходзіць... І раптам у лечкамісіі ў мяне выявілі павышаны ціск, пачалі настойваць на лячэнні, даведку аб прафпрыгоднасці вырашылі выдаць пасля яго. Скарыстаўшы сітуацыю, я далажыў Брыгадзіну, што не прайшоў медыцынскую камісію. Я не падмануў, проста ў сваіх інтарэсах не далажыў, што мне дадуць допуск да работы пасля лячэння. Пётр Іванавіч шчыра засмуціўся, мы разам сталі прадумваць іншыя кандыдатуры на гэтую пасаду. Я са спакойнай душою паехаў працаваць у свой універсітэт.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг будзе 30 ліпеня).*

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая, 11 чэрвеня; 9, 16 ліпеня.)*

# ЗАКРЫЦЦЁ АМЕРЫКІ

## Чаму ЗША вычарпалі крэдыт даверу?

**Візіт у Саудаўскую Аравію кіраўніка Белага дома Джо Байдэна не толькі нашкодзіў інтарэсам ЗША, але і стаў ганьбай для амерыканскага прэзідэнта, які не дасягнуў прагрэсу ні па адным з ключавых пытанняў, адзначыла The Wall Street Journal. Як лічыць журналістка Карэн Эліат Хаус, сустрэча не прынесла ніякіх вынікаў і прайшла «больш чым ганебна». Яна звярнула ўвагу на тое, што ў самым пачатку візіту Байдэн павітаўся з наследным прынцам Саудаўскай Аравіі Мухамедам бін Салманам Аль Саўдам, дакрананнем сціснутых у кулак рук, якое ўжо стала традыцыйным ва ўмовах пандэміі каранавіруса, за што яго жорстка раскрытыкавалі. Так, «Бі-бі-сі» ахарактарызавала візіт Байдэна як «сустрэчу на кулаках». «Далей усё было толькі горш», заўважыла The Wall Street Journal. Відавочна, што «вяртання на Блізкі Усход», аб магчымасці якога неадноййчы заяўляў Вашынгтон, не атрымалася. Чаму Штаты канчаткова вычарпалі крэдыт даверу?**



### БОЛЬШ НЕ САЮЗНІКІ

Па выніках візіту ў Ізраіль і Саудаўскую Аравію, які адбыўся на мінулым тыдні, прэзідэнт ЗША Джо Байдэн абвясціў, што Амерыка працягне весці актыўную палітыку ў рэгіёне, паведаміла агенцтва Reuters. Аднак амерыканскаму лідару не ўдалося стварыць агульную для арабскіх краін і Ізраіля сістэму рэгіянальнай бяспекі для супрацьстаяння Ірану. Спробы Байдэна пераканаць Саудаўскую Аравію рэзка нарасціць здабычу нафты таксама не прывялі да поспеху.

Як заўважалі эксперты яшчэ напярэдадні візіту, малаверагодна, што прэзідэнту ЗША ўдасца аб'яднаць Ізраіль і краіны Персідскага заліва або лідараў Егіпта, Ірака і Іарданіі, якія прысутнічалі на сустрэчы ў Джыдзе, супраць Ірана. Частыя ваганні Вашынгтона ва ўзаемаадносінах з краінамі рэгіёна не выклікаюць даверу ў рэгіянальных гульцоў. Заходнія аналітыкі з сумам канстатуюць той факт, што Саудаўская Аравія і эміраты Персідскага заліва больш не з'яўляюцца надзейнымі саюзнікамі Захаду. Больш за тое, з пачаткам украінскага крызісу краіны Персідскага заліва пачалі праводзіць больш аўтаномную палітыку. Апроч адмовы далучыцца да санкцый, яны імкліва пашыраюць свае адносіны з Расіяй і Кітаем.

Як паведаміла Reuters, саудаўскія ўлады вельмі холадна сустрэлі прапанову Вашынгтона аб агульных з Ізраілем мерах бяспекі. Па словах крыніцы ў адміністрацыі Байдэна, ЗША спадзяюцца інтэграваць абаронны патэнцыял краін рэгіёна ў агульную сістэму. Асаблівую ролю, дадала крыніца, у ёй будзе адыгрываць Ізраіль, які валодае перадавым супрацьракетным узбраеннем. Тым не менш, тлумачыць Reuters, у шэрагу арабскіх краін дагэтуль няма дыпламатычных адносін з Тэль-Авівам, што перашкодзіць стварэнню падобнай сістэмы. Напрыклад, у Эр-Рыядзе заявілі, што не вядоюць пра якія-небудзь перагаворы па стварэнні араба-ізраільскага абароннага альянсу. Акрамя таго, арганізацыя антыіранскага блока ўскладняецца прысутнасцю ў рэгіёне дружалюбных Тэгерану дзяржаў — Лівана, Емена і Ірака.

### ПАСПЯХОВЫ ПРАВАЛ

Улічваючы высокія цэны на паліва ў ЗША, якія сталі адной з прычын рэкорднай за 40 гадоў інфляцыі, пытанне аб павелічэнні здабычы нафты мела вялікае ўнутрыпалітычнае значэнне для Байдэна, адзначае Reuters. Па заявах Вашынгтона, на перагаворах з саўдытамі Байдэну ўдалося дабіцца некаторых поспехаў. «ЗША вітаюць 50-працэнтнае нарошчванне ўзроўню нафтаздабычы ў параўнанні з запланаванымі на ліпень і жнівень аб'ёмамі. Гэтыя і далейшыя крокі, якія мы чакаем у найбліжэйшыя тыдні, дапамогуць значна стабілізаваць рынкі», — паведамлялася ў прэс-рэлізе Белага дома.

Тое, што Белы дом спрабуе падаць як поспех, насамрэч сведчыць аб правале візіту Байдэна на Блізкі Усход, адзначыў vedomosti.ru намеснік дырэктара Інстытута нацыянальнай энергетыкі Аляксандр Фралоў. Ні аб якім значным павелічэнні здабычы нафты гаворка не ідзе. Эр-Рыяд 16 ліпеня заявіў, што можа падняць вытворчасць да 13 мільёнаў барэляў у суткі, але толькі да 2027 года. Такім чынам, дадаў эксперт, ніяк не атрымаецца замясціць пастаўкі з Расіі, якія на момант іх спынення складалі 4,5 мільёна барэляў у суткі. Рэальна ж краіны АПЕК+ павялічаць у ліпені-жніўні здабычу прыкладна на 60 тысяч барэляў у параўнанні з папярэднім планам у 120—125 тысяч барэляў у суткі, гэта і азначае «рост на 50 працэнтаў» у прэс-рэлізе Белага дома.

Па словах Аляксандра Фралова, лічбы сведчаць аб тым, што блізкаўсходнія дзяржавы не маюць намеру ісці Захаду насустрач і дапамагаць яму вырашаць энергетычныя праблемы. Эксперт таксама нагадаў, што візіт прэзідэнта звычайна толькі замацоўвае ўжо заключаныя дамоўленасці. Пры гэтым раннія перагаворы ЗША і Эр-Рыяда па павелічэнні здабычы нафты скончыліся нядачай, таму візіт Байдэна толькі пацвердзіў гэты трэнд. Шанцы таго, што Саудаўская Аравія пойдзе на павадку ў ЗША і парушыць раннія дамоўленасці па скарачэнні здабычы нафты ў рамках АПЕК+, невялікія, лічыць Аляксандр Фралоў. Такі крок прывядзе да цанавой вайны і абвалу цэн. Падобны зыход зусім нявыгадны Эр-Рыяду.



Інтарэсы саудаўцаў дрэнна спалучаюцца з інтарэсамі Байдэна, таму паездка амерыканскага прэзідэнта ў каралеўства не задалася, заўважыла выданне American Thinker. «Яны не толькі адрынулі "саюз бяспекі" паміж ЗША, Ізраілем і Саудаўскай Аравіяй, але і адмовіліся пастаўляць нафту. Закрыўшы трубапровад Keystone XL і выдаўшы штук 30 пастаноў аб спыненні вытворчасці энергіі ўнутры краіны, Джо Байдэн адправіўся ў Саудаўскую Аравію ў надзеі ўпрасіць арабскіх шэйхаў пампаваць пабольш нафты. І што ж? Яны добра з яго пасмяяліся», — канстатавала American Thinker.

### КАНЕЦ ГЕГЕМОНІІ

Прэзідэнту ЗША Джо Байдэну не ўдалося дасягнуць дамоўленасцяў аб павелічэнні паставак нафты з-за таго, што партнёры на Блізкім Усходзе ўбачылі крывадушнае спажывецкае стаўленне Амерыкі да краін рэгіёна пасля апошняга візіту кіраўніка ЗША. Пра гэта ў сваім артыкуле для кітайскай газеты Global Times заявіла рэпарцёр Чжаа Юша. «Неаднаразовыя заявы прэзідэнта ЗША аб так званай пагрозе, што зыходзіць ад Кітая і Расіі на Блізкім Усходзе, прымусілі і без таго перагружаны канфліктамі рэгіён усвядоміць небяспеку, якая ствараецца Вашынгтонам. Эксперты заявілі, што гэтае падлашчванне да краін Блізкага Усходу, калі ЗША знаходзяцца ў нафтавым крызісе, яшчэ больш выкрыла іх эгаізм і крывадушнасць у адносінах да гэтых краін рэгіёна, а выбар няправільнага часу для візіту, які даў мала вынікаў, азначаў, што першая паездка Байдэна на Блізкі Усход была яшчэ адной вялізнай і няёмкай дыпламатычнай памылкай», — напісала Юша. Аўтар адзначыла, што падчас паездкі Байдэну не ўдалося пераканаць Саудаўскую Аравію павялічыць пастаўкі нафты. «Гэты візіт паказаў, што ўплыў ЗША ў рэгіёне зніжаецца, паколькі Байдэн вярнуўся дадому пусты», — дадала журналістка.

Злучаныя Штаты, якія лічаць сябе гаспадарамі Блізкага Усходу, губляюць уплыў у рэгіёне, адзначыла турэцкае выданне Cumhuriyet. Лейтматывам паездкі сталі словы амерыканскага лідара аб тым, што Штаты маюць намер захоўваць актыўнасць на Блізкім Усходзе, каб там не ўтварыўся вакуум, які б запоўнілі Расія і Кітай.

Заява Байдэна прагучала ў кантэксце фарміравання араба-ізраільскага саюза супраць Ірана на фоне аслаблення ўплыву ЗША на Блізкім Усходзе. Аднак у слоў амерыканскага лідара ёсць вялікая праблема: адносіны Кітая і Расіі з арабскімі краінамі і Ізраілем развіваюцца і паглыбляюцца.

Cumhuriyet адзначыла «імперыялістычны характар» заявы Байдэна, на якую Кітай адказаў з акцэнтам на «павазе да суверэнітэту». «На Блізкім Усходзе няма "вакууму", гаспадары Блізкага Усходу — народы, якія пражываюць на яго тэрыторыі», — заўважыў афіцыйны прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Кітая Ван Вэньбінь.

Cumhuriyet заўважыла, што на Блізкім Усходзе няма «вакууму», а ёсць празмернасць «імперыялізму ЗША». Аднак гэтая празмернасць не вечная, аслабленне гегемоніі Вашынгтона забяспечвае распад «амерыканскага Блізкага Усходу», а новы шматпалярны свет спрыяе праявдзенню краінамі Блізкага Усходу шматбаковай знешняй палітыкі, мяркуе Cumhuriyet.

### УДАР У АДКАЗ

Нямецкае выданне Die Welt параўнала, як у Саудаўскай Аравіі ў 2019-м сустракалі расійскага лідара Уладзіміра Пуціна і цяперашняга кіраўніка Белага дома Джо Байдэна. На яго думку, сціплае прывітанне Байдэна паказала, што Расія мае большы ўплыў на Блізкім Усходзе. «Калі расійскі прэзідэнт Уладзімір Пуцін прыбыў у Саудаўскую Аравію, яго картэж пры праездзе па Эр-Рыяду суправаджаў эскорт з шаснаццаці конікаў на высакародных скакунах. Пуціну падалі сапраўдны палац з асабістага ўладання каралеўскага сямейства».

Пры гэтым Die Welt адзначыла, што дзеючага кіраўніка Белага дома Джо Байдэна на Аравійскім паўвостраве сустрэлі зусім інакш. «Амерыканскі прэзідэнт Джо Байдэн прыбывае ў Саудаўскую Аравію без перспектывы падобных ушанаванняў. Яго чакае даволі будзённае пасяджэнне Савета па супрацоўніцтве краін Персідскага заліва, куды, акрамя кіраўніцтва Саудаўскай Аравіі, уваходзяць кіраўнікі дзяржаў Бахрэйна, Катара, Кувейта, Амана і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. У якасці гасцей запрошаны Егіпет, Ірак і Іарданія. Велізарны рост уплыву Расіі на Блізкім Усходзе знаходзіць сваё адлюстраванне і ў пратакольных жэстах», — гаворыцца ў рэдакцыйнай калонцы.

Новае пакаленне арабскіх кіраўнікоў з іншымі амбіцыямі, прыярытэтамі і задачамі засвоіла з мінулых урокаў, што Злучаныя Штаты — ненадзейны саюзнік, а з Расіяй і Кітаем і нават Іранам можна дамаўляцца. Невыпадкова саудаўцы папрасіліся ў БРІКС, адзначыла pravda.ru.

Амерыканіст Малек Дудакоў у размове з gazeta.ru выказаў меркаванне, што адсутнасць поспехаў на Блізкім Усходзе ў ЗША звязана з фігурай лідара гэтай краіны, якая не дазваляе казаць аб доўгатэрміновых планах. Як лічыць эксперт, слабасць Байдэна ўплывае на знешнюю палітыку ў цэлым, многія яго разглядаюць як «кульгавую качку».

Перагаворы прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна з лідарамі Турцыі і Ірана ў Тэгеране сталі «ўдарам у адказ» на спробы Вашынгтона зацвердзіць свой уплыў у рэгіёне. Аб гэтым напісала кітайская газета Global Times. У артыкуле ўказваецца, што кіраўнік Белага дома так і не змог пераканаць прадстаўнікоў Саудаўскай Аравіі ў неабходнасці нарасціць нафтаздабычу, у той час як візіт Пуціна аказаўся больш прадуктыўным і выглядае як «удар кулаком у твар ЗША».

Асабліва адчувальна гэта выглядае пасля заяў Байдэна аб неабходнасці «запоўніць вакуум», якім можа скарыстацца Масква. У выніку спробы Захаду і ў першую чаргу ЗША «загнаць яе ў дыпламатычны кут» не скончыліся поспехам, падкрэслілі аўтары. Яны дадалі, што супраць Вашынгтона таксама працуе тое, што краіны Блізкага Усходу валодаюць вялікай аўтаноміяй і праводзяць усё больш самастойную знешнюю палітыку, незалежную ад амерыканскіх улад.

### ІНВЕСТАРЫ Ў ПАНІЦЫ

Тым часам усё больш амерыканскіх інвестараў з песімізмам ацэньвае перспектывы сусветнай эканомікі і карпарацыйных прыбыткаў. Такую тэндэнцыю выявілі вынікі ліпеньскага апытання фондавых кіраўнікоў, якое праводзіцца Bank of America Corp, паведаміў interfax.ru. Апошняе апытанне прайшло на мінулым тыдні сярод 259 інвестараў, што кіруюць актывамі на агульную суму 722 мільярды долараў. BofA праводзіць штомесячныя апытанні фондавых кіраўнікоў з 1994 года. Сёлета ў ліпені доля рэспандэнтаў, якія чакаюць аслаблення эканомікі ў наступныя 12 месяцаў, дасягнула рэкордных 79 працэнтаў, павялічыўшыся на шэсць працэнтных пунктаў. Доля інвестараў, што чакаюць пагаршэння карпарацыйных прыбыткаў у наступныя 12 месяцаў, вырасла на сем пунктаў, таксама дасягнуўшы 79 працэнтаў.

Стагфляцыі ў сусветнай эканоміцы чакаюць рэкордныя 90 працэнтаў апытаных у параўнанні з 83 працэнтамі месяцам раней. Інвестары скарацілі ўкладанні ў рызыкоўныя актывы да мінімумаў, нябачаных нават у перыяд глабальнага фінансавага крызісу, «цалкам капітуляваўшы» перад тварам змрочнага эканамічнага прагнозу, адзначаюць у BofA.

Доля акцый у інвестыцыйных партфелях у гэтым месяцы ўпала да мінімуму з моманту краху інвестбанка Lehman Brothers у 2008 годзе, доля грашовых рэшткаў дасягнула 6,1 працэнта — максімуму з кастрычніка 2001-га. Сярод найбуйнейшых рызык фондавыя кіраўнікі адзначаюць высокую інфляцыю, глабальную рэцэсію, а таксама «ястрабіны» настрой цэнтрабанкаў. Пры гэтым доля рэспандэнтаў, якія чакаюць запаволення тэмпаў інфляцыі налета, дасягнула максімуму з часоў глабальнага фінансавага крызісу.

**Захар БУРАК.**

Торги в форме открытого аукциона по продаже имущества

## ООО «Аэростар»

**Извещение о проведении <u>24 августа 2022 года</u> открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «Аэростар»**

**Предмет торгов № 1:**

### пресс-форма для выдува ПЭТ-бутылок 1

Начальная цена: 4 332 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 722 руб.)
Сумма задатка: 350 руб. Шаг аукциона: 100 руб.

**Предмет торгов № 2:**

### пресс-форма для выдува ПЭТ-бутылок 2

Начальная цена: 4 332 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 722 руб.)
Сумма задатка: 350 руб. Шаг аукциона: 100 руб.

**Предмет торгов № 3:**

### устройство транспортерное

Начальная цена: 15 048 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 2 508 руб.)
Сумма задатка: 800 руб. Шаг аукциона: 500 руб.

**Предмет торгов № 4:**

### шкаф сушильный промышленный

Начальная цена: 3 762 руб. (включая НДС по ставке 20 %, 627 руб.)
Сумма задатка: 300 руб. Шаг аукциона: 100 руб.

**Местонахождение:** территория ОАО «МПКО», район агрогородка Гатово, Минский район, Минская область

**Продавец имущества:** общество с ограниченной ответственностью «Аэростар» (Адрес: 220116, г. Минск, а/я 49).

**Организатор торгов:** общество с ограниченной ответственностью «Аэростар» (Адрес: 220116, г. Минск, а/я 49).

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает стоимость приобретенного имущества в течение пяти банковских дней с момента подписания договора купли-продажи имущества.

Договор купли-продажи имущества заключается не позднее следующего рабочего дня после проведения аукциона.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток (задатки) по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на счет ООО «Аэростар» не позднее 22 августа 2022 г. на расчетный счет № BY08OLMP30120000960060000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, получатель — ООО «Аэростар», УНП 100375899.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи имущества заключается с победителем торгов не позднее следующего рабочего дня после проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в течение пяти дней после подписания договора купли-продажи.

Торги проводятся **24 августа 2022 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Машиностроителей, дом 24а, помещение 1а, каб.13. Прием документов **с 24.07.2022 по 22.08.2022 включительно.**

Консультации по вопросам участия в торгах и по вопросу ознакомления с продаваемым имуществом осуществляются в рабочие дни с 11.00 до 13.00 и с 15.00 до 17.00 по телефону: +375296200205.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»

(222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б)

**проводит открытый электронный аукцион по продаже:**

| № лота | Наименование | Инв. № | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 «Амкодор», 2010 г. в., регистрационный знак ОК-5 5673, заводской № У397032230410544 | 4540 | 13 806,00 | 1 380,00 |
| 2 | Прицеп тракторный 2ПТС-4, 1989 г. в., регистрационный знак БЭ 1475, заводской № 7953 | 8647 | 936,00 | 93,00 |
| 3 | Трактор гусеничный ДТ-75ЕМ, год выпуска не установлен, регистрационный знак ОК-5 5672 | 23020 | 2 106,00 | 210,00 |
| 4 | Автомобиль грузовой седельный тягач МАЗ-6422, 2008 г. в., регистрационный знак АЕ 8305-5, рама № Y3M6422A580000778, цвет белый | 200785 | 4 914,00 | 491,00 |
| 5 | Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 «Амкодор», 2011 г. в., регистрационный знак ОК-5 3151, заводской № У39ЭО32230411682 | 04541 | 25 350,00 | 2 535,00 |
| 6 | Агрегат комбинированный широкозахватный АКШ-6, 2009 г. в., заводской № 80 | 4631 | 6 006,00 | 600,00 |
| 7 | Плуг болотный навесной ПБН-6-50 | 119600 | 2 808,00 | 280,00 |
| 8 | Борона дисковая тяжелая Л-113 А-02 (БДТ-3) | 119461 | 3 432,00 | 343,00 |
| 9 | Камнеуборочная машина УКП-0,7; 1989 г. в. | 5659 | 8 658,00 | 865,00 |
| 10 | Агрегат дисковый навесной АДН 3.0 Р16, 2008 г. в., заводской № 132 | 23014 | 3 900,00 | 390,00 |
| 11 | Плуг полунавесной оборотный ППО-(4+1)-40КЗ без модуля, 2009 г. в. | 119458 | 4 836,00 | 483,00 |
| 12 | Борона дисковая тяжелая Л-114 А-03 (БДТ-7), 2009 г. в. | 119463 | 7 176,00 | 717,00 |
| 13 | Борона дисковая навесная мелиоративная БДН-3А, 2013 г. в., заводской № 321 | 119598 | 7 098,00 | 709,00 |

Стоимость снижена на 35 %.

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б.

**Электронные торги состоятся *11 августа 2022 года* в 10.00.**

**Заявления с прилагаемыми к ним документами на участие в электронных торгах принимаются не позднее *09 августа 2022 года включительно до 17.00**.**

